Ніва 50

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

ГЕОРГІЙ ВАЛКАВЫЦКІ ☞ 9

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 10 (2599) Год LI | Беласток, 5 сакавіка 2006 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

М. Маркевіч: Гэты дзень павінны адзначыць і тыя людзі, якія хочуць кінуць беларусаў на калені і трымаць іх у такім стане ўсё жыццё...

„Рацыя” — рэактывацыя!

Інфармацыя пра адкрыццё Радыё „Рацыя” паўтаралася прынцыпова кожную гадзіну ўвесь дзень (22 лютага) у агульнапольскіх і лакальных СМІ. Ньюс прагучаў таксама ўва ўсіх важнейшых сусветных масмедыях, а першую перадачу ў прамым эфіры сфільмавала, між іншым, чэшскае тэлебачанне. Яе змест сам гаварыў за сябе — першыя навіны паведамлялі пра арышты і рэпрэсіі, якія ў мінулую ноч спасцігілі чатырох дзеячаў дэмакратычнай апазіцыі ў Беларусі.

Таксама ў час афіцыйнага адкрыцця, — як пасля пісала адна мясцовая штодзённка, — рух у рэдакцыі прыблізна быў такі, як на недалёкім базары. Факт, у сціплым памяшканні радыё госці, палітыкі і журналісты ледзь памясціліся. З нагоды падзеі можна было пачуць слушныя ды нават ашаламляльныя выказванні:

— Вельмі мы рады, што ў Польшчы ёсць такое моцнае беларускае асяроддзе, якое хоча працаваць у карысць дэмакратыі ў Беларусі, — гаварыў абраны ад падляшскай структуры партыі Права і справядлівасць віцэ-маршалак Сената Кшыштаф Путра.

— Мы, палякі, доўга змагаліся за незалежнасць і дэмакратыю, нам дапамагалі краіны Захаду, — адзначыў Путра. — Сёння ў нас гістарычны доўг у адносінах да нашай суседкі, Беларусі. Важна, каб палякі ў Беларусі таксама маглі паслухаць роднае слова. Мы верым, што дэмакратызацыя Беларусі паўплывае на паляпшэнне ўмоў жыцця тамтэйшага грамадства.

Аднаўленне дзейнасці Радыё „Рацыя” гэта партнёрскі, агульнабеларускі праект. Пачаў ён ажыццяўляцца пасля сустрэчы з прэм’ер-міністрам Казімежам Марцінкевічам, які сёлета па запрашэнні Беларускага саюза гасцяваў на праваслаўнай Куцці ў Беластоку. Пакуль радыё вяшчае дзве гадзіны на сярэдніх хвалях 1080 кГц і частоце 1038 УКХ з Літвы. Пакуль чуваць яго толькі ў Беларусі. Цягам будучага месяца ўзнікнуць таксама беларускія і польскія перадачы для меншасцей па абодвух баках мяжы.

* * *

Мікола Маркевіч, праграмны шэф Радыё „Рацыя” (рэпрэсаваны рэдактар гродзенскай „Пагоні”) назваў падзею „святлом у цемры”:

— Беларусь уяўляе сёння сабой адзін вялікі канцлагер, — казаў ён. — Наша краіна глядзіцца ў крывое люстэрка лукашэнкаўскага тэлебачання і мы там не пазнаем сябе, не ведаем куды нам ісці, не ведаем што рабіць...

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Алег Латышонак, Мікола Маркевіч, Адам Ліпінскі

„Рацыя” — паводле Маркевіча — гэта добры сігнал, гэта святло, якое паказвае, што беларусы могуць зрабіць нармальную дэмакратычную краіну, у якой запануе справядлівасць і праўда.

Маркевіч звярнуўся таксама да ворагаў беларушчыны і дэмакратыі:

— Гэты дзень павінны адзначыць і тыя людзі, якія хочуць кінуць беларусаў на калені і трымаць іх у такім стане ўсё жыццё. Яны павінны пабачыць і зразумець, што з намі ўсе людзі добрай волі. Што з намі праўда! Што з намі справядлівасць! Што з намі Бог!

* * *

Хуткая рэактывацыя „Рацыі” невыпадковая. Аб’ектыўная незалежная інфармацыя мае зараз за задачу падмацаваць дэмакратычную апазіцыю ў час прэзідэнцкіх выбараў. У першай перадачы прагучала, між іншым, інтэрв’ю з Аляксандрам Мілінкевічам.

— Яшчэ некалькі тыдняў да Аранжавай рэвалюцыі на Украіне мала хто ў Польшчы верыў, што там магчымыя змены, — адзначыў міністр Адам Ліпінскі. Дэкларацыю салідарнасці з Беларуссю Ліпінскі падмацаваў канкрэтамі. Успомніў ён пра нядаўна рэактываваны Сеймам РП спецыяльны фонд, які будзе несці падтрымку народам Усходняй Еўропы.

— Гэты інстытут распараджаецца аграмадным бюджэтам, — запэўніў міністр. Паводле яго слоў, Радыё „Рацыя” — гэта доўгатэрміновы праект і незалежна ад вынікаў прэзідэнцкіх выбараў будзе далей працягваць сваю дзейнасць. Для гэтага ўжо падрыхтаваныя сродкі, якія забяспечаць рэалізацыю і развіццё ідэі. Пры нагодзе адзначыў заслугу Грамадзянскай платформы:

— Хаця ў апошні час між Правам і справядлівасцю ды Грамадзянскай платформай шмат разыходжанняў, то ў справе Беларусі мы аднадумцы.

* * *

Задавальненне з нагоды рэактывацыі радыё не скрывалі супрацоўнікі „Рацыі”:

— Для мяне гэта мае вялікае псіхалагічнае значэнне, — гаварыў Міхал Андрасюк, — гэта наяўны доказ таго, што мы можам нешта зрабіць, дабіцца поспеху і знайсці падтрымку. Яшчэ больш мацуе яго рэальная магчымасць несці падтрымку суродзічам з-за мяжы.

— Інфармацыя — гэта дэфіцытны прадукт, — перакананы Андрасюк. — Чалавек не можа быць вольным, калі не мае доступу да інфармацыі.

Мінская журналістка Яна Каменская, з-за непадпарадкавання цэнзуры два гады таму страціла працу.

— Галоўнае для мяне — гэта магчымасць працаваць на радыё журналістам. Перспектыва супольнай працы з мясцовымі беларусамі і палякамі, — мяркуе Яна Каменская, — цікавая і карысная.

Ганна Кандрацюк

Выбары ☞ 2

Віктар Сазонаў

Хтосьці затрыманы, у кагосьці праведзены вышук, камусьці выстаўлена абвінавачанне, нехта выкліканы ў суд, іншы „запрошаны” на „размову” ў праваахоўныя органы, нейкаму прыйшла позва, да гэнага прыйшлі без выклікаў, гэтага папярэдзілі, гэнага засудзілі, яшчэ аднаго збілыталі з яшчэ адным, таго зусім выгналі з універсітэта, а за астатнімі проста цікуюць...

Падарожжа ☞ 5

Аляксандр Вярбіцкі

За згортваннем вясковага насельніцтва і згортваннем вясковых прыпынкаў згортваецца і бельскі вакзал. Замест колішніх трох чыгуначных білетных кас працуе цяпер адна, замест колішніх трох аўтобусных кас цяпер працуе таксама адна. А калі і гэтыя касы стануць непатрэбнымі, непатрэбны стане і вакзальны будынак...

Веды па мове ☞ 8

Аляксей Мароз

— Лёгка было пісаць пра паходжанне назвы вёскі Трывежа, бо аб гэтым мы чыталі ў нашай кніжцы, — гаворыць Эвеліна Прабуцкая. — Рыхтуючыся да конкурсу, вучыліся мы ўсяго пакрысе. Я многа чытала пра Статуты Вялікага княства Літоўскага і добра зрабіла, бо на конкурсе была задача аб іх. Аднак на ўроках я найбольш люблю аналізаваць літаратурныя творы...

У Нарве ☞ 11

— Культура гэта капітал, які можна выкарыстаць дзеля развіцця гміны, — на ўступе заўважыла дырэктар ГОК. Пацвердзіў гэта па-беларуску і войт Якуб Садоўскі, для якога выстава народнага мастацтва была нагодай пахваліцца і іншымі гміннымі дасягненнямі...

Наш юбілей ☞ Д I

Яўген Вапа

Журналісты „Нівы” на працягу гэтага перыяду часу, можна смела сказаць, выканалі рэч незвычайную — сталі летапісцамі пэўнай часткі беларускага народа, якому выпала жыць у сваёй Малой Айчыне — Беласточчыне. Тое, што напісана пяром, не вырубаць і тапаром — здаўна паўтаралі разумныя людзі. І людзі з асяроддзя „Нівы” зразумелі гэтае пасланне...

Пагоня за апазіцыянерамі

— Мы ні ў якім разе не збіраемся анічога фальшаваць, — заявіў кіраўнік Беларусі Аляксандр Лукашэнка 24 лютага на сустрэчы з навучэнцамі Мінскага Суворaўскага ваеннага вучылішча. І дадаў: — Нам выгадна паказаць чэсным і нават нячэсным людзям, як пройдуць прэзідэнцкія выбары ў Беларусі.

„Мы не збіраемся анічога фальшаваць". Гэтая фраза ўжо гаворыць сама па сабе. Нават калі і сапраўды ніхто і нічога не збіраецца фальшаваць, то ці гэта кампетэнцыя аднаго з кандыдатаў на прэзідэнцкіх выбарах? Хто стварыў такую сістэму, дзе фальшаванне, ці не фальшаванне, залежаць ад нечага рашэння? Хто адказны за тое, што еўрапейская краіна Беларусь апынулася ў такім стане, калі ўсе, ад прэзідэнта, да таго грамадзяніна, які яшчэ не ведае за каго будзе галасаваць і ці пойдзе галасаваць, гавораць пра мажлівасць або немажлівасць фальшавання на выбарах?

— Нам баяцца няма чаго, гэтых назіральнікаў, — сцвердзіў сённяшні прэзідэнт Беларусі. — Хай едуць і глядзяць, нават нашы супраціўнікі. Мы ведаем кожнага. Ведаем, што яны будуць аплёўваць нашы выбары.

Здаецца, сённяшні кіраўнік дзяржавы зараз і раней пра выбары патлумачыў усё. І колькі адсоткаў ён будзе мець, і што скажа наконт гэтага міжнародная супольнасць, і хто „нас" будзе „аплёўваць", і хто „нашы" ворагі, і... сяброў, здаецца, паводле гэтых высноваў у „нас", дакладней будзе сказаць у „яго", не засталося. Ён сам гаворыць за сябе. І пра сябе. Падтаквае толькі старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына. А больш (маюцца на ўвазе хоць больш-менш вядомыя палітыкі хоць з нейкім імем) — нікога. Толькі ён і дзяржаўная машына.

Зусім іншае — дзяржаўная сілавая машына. Пра людзей, якія там працуюць, гаворка асобная. Іх сімпатыі сталі зразумелыя падчас кампаніі па зборы подпісаў. Больш актыўна дапамагалі апазіцыйным кандыдатам толькі самі зборшчыкі подпісаў. Але людзі адно, а сілавая машына штосьці іншае. Яе ўдзельнікі толькі элементы гэтай машыны і іх палітычныя погляды застаюцца па-за працоўнай дзейнасцю. Да пары, да часу. А пакуль што... затрыманні, арышты, пратаколы, запалохванне, цікаванне і цкаванне.

Хіба што на мяжы, спіс каго трэба праверыць большы, чым каго правяраць неабавязкова. Уражанне, што наконт затрыманняў за датэрміновую перадвыбарчую агітацыю разгарнулася сапраўднае сацыялістычнае спаборніцтва. Ну а наконт цікавання, якое мае і псіхалагічна-запалохвальныя, і практычна-перашкаджальныя мэты, трэба пісаць цэлыя аповеды. У гэтым спісе ўсе: і кіраўнікі штабоў, і партыйныя дзеячы, і праваабаронцы, і такія арганізацыі, як Саюз беларускіх пісьменнікаў, які вінаваты ў тым, што на яго будынку вісіць старадаўні беларускі герб „Пагоня", і журналісты (замежныя і айчынныя), і актывісты, што збіраліся арганізаваць незалежнае назіранне за выбарамі, на якіх, як нас заверылі: „Мы не збіраемся анічога фальшаваць", і проста актывісты, і проста...

Хтосьці затрыманы, у кагосьці праведзены вышук, камусьці выстаўлена абвінавачанне, нехта выкліканы ў суд, іншы „запрошаны" на „размову" ў праваахоўныя органы, нейкаму прыйшла позва, да гэнага прыйшлі без выклікаў, гэтага папярэдзілі, гэнага засудзілі, яшчэ аднаго зблыталі з яшчэ адным, таго зусім выгналі з універсітэта, а за астатнімі проста цікуюць. Звоняць у дзверы, ходзяць за плячамі, ездзяць за машынай... Калі ў цягніку нешта ў некага (а невядома ў каго) прапала, то правяраюць іх, калі машына (а невядома якая машына) зрабіла выпадак, то правяраюць іхныя машыны, калі нехта нешта напісаў на сценах (а невядома хто), то правяраюць іх кватэры, гаражы. Шукаюць фарбу, якой зроблены надпісы, але забіраюць камп'ютэр, газеты, кніжкі... Папросту ганяюцца за імі. Імі — гэта значыць за тымі, хто рэалізоўвае сваё канстытуцыйнае права працаваць на выбарах: збіраць подпісы не за таго, хто паводле дзяржаўных сацыёлагаў атрымае чарговую „элегантную" перамогу, пісаць не пра гэтую перамогу, агітаваць не за будучага пераможцу, спрабаваць назіраць за „геніяльнай" перамогай... Што гэта, новае паляванне за вядзьмаркамі ці пагоня за тымі, хто ў сваіх руках трымае „Пагоню". І што гэта дасць сённяшняй уладзе? Бо тыя, хто маюць „Пагоню", пагоні не баяцца. А вось тыя, хто ганяюцца, можа быць упершыню за апошнія дванаццаць гадоў, пачынаюць думаць, ці тых яны ловяць.

Віктар Сазонаў (Гродна)

Хто праўду кажа

Пры маёй ранняй памяці асноўнай крыніцай інфармацыі ў маім вясковым асяроддзі былі вусныя выказванні суседзяў, найчасцей старэйшых вяскоўцаў. Былі гэта не толькі навіны, але і лекцыі светапогляду. Іх змест і афарбоўка залежалі галоўным чынам ад напрамку іх паходжання. Нашы старажылы свае веды атрымоўвалі з усходняга напрамку і ў іх склаўся перадаваемы малодшаму пакаленню стэрэатып, што на ўсходзе б'е крыніца праўды. А калі гэтыя дары падаваліся на новым, невядомым раней друкаваным падносе, значыць у кніжцы або газеце, гэта толькі той стэрэатып замацоўвала; людзі аргументавалі, што „а ў газеце напісалі так і так!" У нашых заходніх суседзяў, якія сілкаваліся інфармацыямі з захаду, склаліся, вядома, іншыя стэрэатыпы, да якіх наша тутэйшае грамадства адносілася — далікатна кажучы — крытычна. І нават наглядаемыя з усходу разыходжанні між прапагандай і фактамі не пераарыенціравалі нашага светагляднага стрыжня; пра гэта пераконваюся і з гутарак, і з допісаў у рэдакцыю.

Да вусных і друкаваных медыяў у апошніх дзесяцігоддзях далучыліся электронныя і ў масавым маштабе сёння пануе тэлебачанне. У падцэнзурны час, асабліва геркаўскі, даволі папулярны быў, вядома, неафіцыйны, лозунг, што тэлебачанне хлусіць. Цэнзуры ўжо ў нас няма, але да тэлебачання надалей трэба ставіцца з недаверам. Бо што ж найвыгадней аглядаць шырокай публіцы? А тое, што не патрабуе асаблівага напружвання думак, значыць, м.інш., выступленні нашых палітычных лідэраў. А яны адкрыта закідаюць сабе ўзаемна хлусню; асабліва выразна гэта бачна цяпер у час калявыбарчых тусовак. Аднак сённяшняе польскае тэлебачанне, у адрозненне ад ранейшага, амаль нічога не прыхоўвае. І гэта свайго роду бяда, бо з такіх інфармацыйных джунгляў выдэстыліраваць праўду цяжэй чым самагонку з брагі. І людзі справядліва наракаюць на інфармацыйную непрыгоднасць нашага тутэйшага вяшчання, асабліва найбольш прывычнага, г.зв. публічнага.

Аднак у Польшчы працуе вяшчанне, да якога гледачы, а асабліва слухачы, маюць вялікі давер; гэта яно, паводле агульнага меркавання, вызначыла такі а не іншы вынік восеньскіх выбараў у нашай дзяржаве. Я, як чалавек усходняга менталітэту, абыходзіў яго частоты шырокім кругам, але аднойчы здарылася мне не мець альтэрнатыўнага выбару па ўсёй настройцы. Там адзін мужчына, якога жонка прагнала за лодырства, пытаўся вядучага, як яму вярнуцца да сям'і. Адказ не прадбачваў ніякіх ягоных абавязкаў наконт дзяцей, толькі перабіранне каралікаў; і я зноў падаўся шырокім кругам... Пра гэтае вяшчанне шмат меркаванняў у нашых медыях і ў адным з апошніх нумароў „Rz" прачытаў я на гэты конт абшырнае выказванне Люблінскага мітрапаліта Юзафа Жыцінскага. Меркаванне аўтарытэтнага іерарха даволі крытычнае, але і ў мяне з'явіліся свае высновы. Першая такая, што вяшчанне адносіцца да некаторых карыфеяў польскага публічнага жыцця, м.інш. да Часлава Мілаша ці Яна Новака-Езяранскага, гэтаксама, як і згаданае раней геркаўскае тэлебачанне. Далей: аўтар прыводзіць выказванне адной пажылой слухачкі вяшчання, якая прызнаецца, што адкрыла яно ёй новыя духовыя гарызонты. То я так сябе цяпер пытаю: а што яна бачыла раней? Дэкларавалася няверуючай і непрактыкуючай? А цяпер, заміж спяваць „Інтэрнацыянал" перабірае каралікі, астаючыся ў маладняцкім прапагандысцкім антуражы з рэзка пазначанымі тымі самымі ворагамі?..

Мы, тутэйшыя, з арыентальна арыентаванай душой, напэўна чужаемся такога вяшчання, а значыць і ягоных метадаў. Мы хвалім тыя парадкі, што ў Беларусі, значыць, абмежаванне інфармацыйнага плюралізму да адзінага ўладапаклонства. Ну бо калі ў адной газеце пішуць адно, у іншай іншае, то чорт ведае каму верыць. А людзі ж прывыклі, што ва ўсіх медыях павінна быць адно, так як у час іх маладосці. І няважна, ці тая уніфікаваная інфармацыя нясе праўду ці хлусню, бо калі не стане альтэрнатывы, людзі з палёгкай паверацъ у тое, што ім скажуць. А на паперы і ў эфіры астануцца тыя самыя ворагі, якіх прапагандысцкі пальчык паказаў раней.

У маім кабельным вяшчанні няма Беларускага тэлебачання, але гэта, у інфармацыйным плане, ніякі клопат. Канкрэтную, адназначную і нават у пэўным сэнсе падобную зместам інфармацыю я атрымаю і ў плюралістычнай Польшчы.

Аляксандр Вярбіцкі

Вачыма еўрапейца

Фальшыўкі Малгосі

З зацікаўленнем сачыў я за лёсам маладой польскай спявачкі са Шлёнска Госі Анджэевіч. Як ужо пісала „Ніва", выступіла яна як адзіная прадстаўніца іншай краіны ў адборачным канцэрце ў Беларусі да сёлетняга фестывалю Еўрабачання ў Афінах. Спявала па-англійску песню пад загалоўкам „Небяспечная гульня". Беспаспяхова. Пасля вяртання з Мінска на ейных інтэрнэт-старонках паявіліся жалі: „Госю сустрэла вельмі прыхільная атмасфера. Памаглі ёй у падрыхтаванні і сарганізаванні гурту, які з ёю выступіў у час канцэрта. Выступленне спадабалася публіцы, якая ўзнагародзіла яе працяглымі апладысментамі. Гося аднак не трапіла ў фінальную тройку, хоць была адной з улюбёнак публікі. Пасля аб'яўлення вынікаў аказалася, што на некалькі песень немагчыма было аддаць свае галасы па прычыне тэлефоннай блакады. Сярод гэтых песень апынуўся таксама і Госін твор". Аўтары інтэрнэт-старонкі гэтай вакалісткі спасылаюцца на пасляканцэртную ідэю аднаго з беларускіх часопісаў: „Відавочна, польска-беларускі дыпламатычны канфлікт перашкодзіў людзям ацаніць прыгажуню. На яе аддало свае галасы толькі 200 гледачоў". Як заўважыў адзін з наглядальнікаў мінскага адборачнага канцэрта, „яна спявала вельмі меладычна і не фальшавала". У іншым месцы апісалі так польскую спявачку: „Зграбная бландзінка з арыстакратычнымі манерамі".

Сама спявачка не скрывала пасля вяртання з Мінска:

— Адзінае, што магу сцвердзіць, дык тое, што галасаванне было, на жаль, зафальшаванае.

Якая была праўда, цяжка сказаць. Факт, аднак, што калі б Малгося хацела быць паспяховай і дастацца на фіналы ў Афінах пасля няўдачнай спробы ў польскім адборачным канцэрце, магла б выбраць любую іншую краіну, з якой магла б стартаваць, хоць бы і Мальту. Аднак, як казала, быццам па эканамічных прычынах, выбрала Беларусь, краіну, у якой усё можа здарыцца, а ў публічным жыцці, амаль у кожнай сферы не адна гульня несумленная, а нават небяспечная. Гэта можна было прадбачыць. Само з'яўленне Малгосі на беларускім адборачным канцэрце ўжо стварала прадпасылку для прапагандысцкай гульні: „Вось, гляньце, як Польшча ацаняе сваіх мастакоў, а для нас няма ў гэтай меры ніякіх межаў, мы ствараем магчымасці мастацкага развою". На жаль, не толькі палітыкі, але і мастакі павінны ведаць кодэкс наконт паводзін у недэмакратычнай рэчаіснасці. Мастацтва таксама бывае прыладай палітычных ператусовак. Выразным прыкладам быў байкот м.інш. спевакоў і акцёраў у ваеннае становішча ў Польшчы. Тыя, хто з гэтага выламаліся, былі паказным інструментам для апраўдання рашэнняў каманды генерала Ярузельскага. Рашэнне Малгажаты Анджэевіч аб удзеле ў беларускім адборачным канцэрце было памылкай, з фактарам шырэйшым чым адно мастацкі. Аж хочацца сказаць: „Jak nie potrafisz, nie pchaj się na afisz". Гэта была фактычна небяспечная гульня.

Мацей Халадоўскі

БГКТ: паўвека „без палітыкі”

Фота ІААННЫ ГОСЦІК

Віншаванні і захапленні

Фота МАЦЕЯ ХАЛАДОЎСКАГА

Ян Сычэўскі

Дзесяткі ўзнагарод, вылучэнняў і дыпломаў было ўручаных у ходзе юбілейнага засядання Галоўнага праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў зале Ваяводскай управы ў Беластоку. У ліку афіцыйных гасцей не было агульнапольскіх і мясцовых палітыкаў з г.зв. вышэйшай паліцы. Затое шматлюднай была афіцыйная дэлегацыя з Беларусі, м.інш. з міністэрстваў замежных спраў, культуры, камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей.

У першай чарзе і вельмі цёплымі словамі старшыня Галоўнага праўлення БГКТ Ян Сычэўскі прывітаў епіскапа Беластоцкага і Гданьскага Іакава, дэпутата Сейма, а да нядаўна падляшскага ваяводу Марка Сташлінскага, старшыню Падляшскага самаўрадавага сейміка Збігнева Кшывіцкага і члена Падляшскай управы Кароля Тыленду. У ліку ўзнагароджаных медалямі нацыянальнай адукацыі апынуліся праф. Міхал Кандрацюк — навуковы кіраўнік канферэнцыі „Дарога да ўзаемнасці” і былы загадчык Кафедры беларусазнаўства Універсітэта ў Беластоку, а таксама Яўген Валкавыцкі — шматгадовы дырэктар Комплексу школ у Нараўцы. Медалі заслужаным у галіне культуры „Gloria Artis” атрымалі шматгадовыя дзяячкі Таварыства Люба Гаўрылюк, Ніна Цыванюк і Валянціна Ласкевіч. Таксама пасол Рэспублікі Беларусь у Польшчы Павел Латушка з нагоды юбілею БГКТ уручыў памятныя дыпломы і ўзнагароды ды паведаміў аб прысваенні БГКТ спецыяльнай узнагароды Савета Міністраў РБ:

— Я ўпэўнены, што дзякуючы вашаму ўкладу скарбонка еўрапейскай і агульнасусветнай культуры будзе больш важкай і разнароднай, а беларусы Польшчы, так як і палякі Беларусі, у далейшым будуць садзейнічаць развіццю добрасуседскіх адносін паміж нашымі дзяржавамі.

Фота МАЦЕЯ ХАЛАДОЎСКАГА

Злева: Міхал Кандрацюк, Яўген Валкавыцкі — лаўрэаты медаля нацыянальнай адукацыі

Фота ІААННЫ ГОСЦІК

Пасля пасяджэння — на фестываль

Пасол Латушка адзначыў:

— Заўсёды можаце разлічваць на нашу падтрымку ў вашай дзейнасці.

Як гаварыў Ян Сычэўскі, за мінулае паўстагоддзе БГКТ заставалася вернае ідэалам звязаным з такімі каштоўнасцямі як культурная і этнічная адметнасць, развіццё нацыянальнай культуры, талерантнасць:

— Я абавязаны нізка пакланіцца тым, якія ад пачатку дзейнасці нашай арганізацыі, не адзін раз рызыкуючы спадам папулярнасці, а часам і ўласнай бяспекай, актыўна дзейнічалі на полі беларускай культуры і асветы, намагаліся падкрэсліць, што найбліжэйшае сэрцу тое, што дастаецца на гэтым свеце ад бацькі і маці, ад нашых продкаў, што звязанае з месцам нашага нараджэння, з функцыянаваннем духовасці нашай супольнасці, кожнага з нас у індывідуальным сэнсе.

Словы старшыні ГП сустрэліся з бурнымі апладысментамі ўдзельнікаў мерапрыемства:

— Рэспубліка Беларусь для нас — блізкая, этнічная радзіма. Да Рэспублікі Беларусь мы заўсёды ставімся з пашанай, поўнай талерантнасцю і ўшанаваннем. Мы лічым, што няма большай і самай слушнай улады чым суверэнны беларускі народ. Гэты прынцып мы шануем і будзем шанаваць нягледзячы на тое хто, каго і калі хоча выбіраць.

Асабліва ветліва Ян Сычэўскі прывітаў галоўнага рэдактара „Голасу Радзімы” Наталлю Салук:

— Гэта адзіная газета на свеце, якая так прыгожа паказала дасягненні БГКТ на працягу 50-годдзя і ў вельмі цывілізаваны спосаб ставіцца да ўсяго таго, што звязана з беларускай меншасцю ў Польшчы.

Юбілейныя віншаванні паступілі, між іншым, ад мітрапаліта Варшаўскага і ўсяе Польшчы Савы, ад прадстаўнікоў беларускай меншасці з іншых краін, у тым ліку з Латвіі, Казахстана, Літвы, Эстоніі, Украіны, Расіі, а таксама ад міністра адукацыі РБ.

Сярод шматлікіх гасцей, прадстаўляючых улады Беларусі, быў намеснік міністра культуры Валеры Гедройц. У кулуарах сказаў ён журналістам:

— Мы зацікаўленыя ў тым, каб БГКТ працавала плённа, у першую чаргу таму, што тут захоўваецца асяродак беларускай культуры і дзейнасць гэтай арганізацыі з’яўляецца важным укладам у добрасуседскія кантакты.

Дадаў ён яшчэ:

— Палітыка ёсць палітыка, але жыццё народа і развіццё яго культуры не заўсёды падпарадкоўваюцца палітычным меркаванням.

Раіна Стэфанчук

Анатоль Парэмбскі, Беларускаму грамадска-культурнаму таварыству ў Беластоку на 50-годдзе

Адрэзалі нас ад радзімы,
Як цела кусок ад істоты,
І гразіла целу гангрэна,
Бо рану абставілі плотам.

Суседзі кроў выменіць мелі,
Каб зліцца з іхняй натурай,
Рабілі ўсё што хацелі,
Лёс цела быў ніклы, пануры.

Ды парастак цела пусціла,
Нядоля яго гартавала
І воляй, надзеяй карміла,
Каб цела зусім не прапала.

І так нарадзілася прага.
Не можам паддацца знішчэнню.
Народу і гонар, і права
Задбаць пра дабро пакаленняў.

Старыя адкапалі песні,
Ды творчыя ў нас літаратары
А моладзь і ў вёсцы, і ў месце
Любіць мову сваіх мамаў, татаў.

Па вёсачках нашых, сялішчах,
Крыніца народных талентаў,
Што могуць умельцы прабіцца,
Заслуга дзеячаў БэГэКаТэ.

Пачуў свет душу беларуса
І песні народнай, у мове.
Усё роднае стала пакусай,
Каб жыць, не загінуць у аковах.

За іх тытанічную працу
На ніве культуры народнай
Кажам ім вялікае дзякуй
За плённае пяцідзесяцігоддзе.

Вілюкі

Невялікая вёсачка Вілюкі ляжыць пад паўднёва-заходняй сцяной Белавежскай пушчы ў Дубіцкай гміне (Гайнаўскі павет). Мінулае гэтай мясціны пачынаецца недзе ў канцы XV стагоддзя. Якраз тады, калі па загадзе польскага караля і вялікага князя літоўскага Казіміра Алехна Саковіч — староста бельскі, Мішко Вішторавіч — лоўчы гаспадарскі, Аляксандр Дрождча — намеснік камянецкі ў 1460-1475 гадах канчаткова аддзялілі Бельскую пушчу ад Камянецкай. На дрэвах паявіліся зацёсы-„рубяжы" ўздоўж рэчкі Орлі ад цяперашняй вёскі Карыцкі да былога маёнтка Вэрсток. Такія знакі ўсё ж не спынялі падуладных бельскаму старасту паляўнічых, бортнікаў, сялян ад „уваходаў" ва ўладанні намесніка камянецкага. І той адгарадзіў Камянецкую пушчу ад суседзяў ланцужком „стралецкіх" паселішчаў, такіх як Белая Страж, Вілюкі, Войнаўка, Вітава. Стральцы-асочнікі абавязаны былі ахоўваць пушчу. Тыя „стральцы", што далі пачатак Вілюкам, мелі права жыць з надзеленай ім зямлі. Ад імя Віла (гэта царкоўнае імя Віл) павялася назва мясцовасці. Цікава, што гэтае прозвішча захавалася тут і да сённяшняга дня: у вёсцы жывуць першнаперш Вілюкі і Саевічы.

Трэба прызнаць, што колішнія „стральцы" ўсё ж патрапілі ўсцерагчы колішнюю Камянецкую, або цяперашнюю Белавежскую пушчу: калі ад былой Бельскай пушчы асталіся ўсяго пралескі ды зараснікі, то паўднёва-заходняя сцяна Белавежскай пушчы стаіць на тым жа месцы, што і ў канцы XV стагоддзя, значыць больш за 500 гадоў.

У канцы XVIII стагоддзя Вілюкі належалі да маёнтка Вэрсток. Жыхары падпіраліся грыбком, ягадай, а то і рознымі пасткамі на дзікага звера ў пушчы. Калі паншчына была ліквідавана, тутэйшым сялянам не палегчала, бо атрымалі яны самую дрэнную зямлю, няўдобіцу. Жылі, між іншым, з таго, што зарабілі ў пушчы пры пасадцы, ачыстцы ды вывазцы. **(мох)**

Жабракі

Калісь, як я быў малым хлапчуком, па вёсках хадзілі жабракі і прасілі пару грошаў на хлеб або даць ім паесці. За гэта яны дзякавалі і ішлі далей. Прайшлі дзесяцігоддзі і жабрацтва бумерангам вярнулася да нас ды стала звычайнай з'явай.

Цяпер грошай просяць не толькі маламаёмныя. Напрыклад, радыё і тэлебачанне без спонсараў не зрабілі б сваіх праграм. Святары высылаюць каляднікаў з лістом паперы, на якім пазначана хто і колькі павінен даць грошай. Калісь каляднікі хадзілі з гвяздай і не прасілі грошай, а толькі бралі тое, што ім людзі давалі.

А нам, пенсіянерам, да пенсіі нічога не дадаюць, а толькі забіраюць. У мяне з пенсіі вылічваюць 128 злотых у месяц. Ну што ж, і мне прыйдзецца шукаць спонсараў і тады стану легальным жабраком. Мо тады нажабрую на лякарствы? **Дзядзька Захар**

З бондараў у чыгуначнікі

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Большасць забудовы ў Дабрывадзе састаўляюць драўляныя хаты пастаўленыя ў пасляваенны перыяд

Бондары з Дабрывады, якія ў міжваенны перыяд рабілі для жыхароў суседніх вёсак і купцоў з больш аддаленых мясцовасцей вёдры, бочкі, ступы і іншыя драўляныя вырабы, пасля вайны перасталі калупацца ў драўніне і масава падаліся працаваць на чыгунку. Дзеці ішлі па слядах бацькоў і станавіліся кандуктарамі, машыністамі, рабочымі чыгуначных дэпо. У васьмідзесятых гадах амаль у кожнай хаце ў Дабрывадзе была прынамсі адна асоба працалаўладкаваная на чыгунцы. Жыхары вялікай вёскі дадаткова абраблялі сваю зямлю і займаліся гадоўляй быдла.

Праца на чыгунцы

Забудова ў Дабрывадзе нехарактэрная нашым вёскам. Гаспадары жывуць на некалькіх вуліцах, якія сыходзяцца ў цэнтры сяла, а некаторыя перасякаюцца.

— Раней у нашай вёсцы была вельмі шчыльная забудова. У 1949 годзе быў вялікі пажар. Гаспадары сталі тады будавацца па-за вёскай, бліжэй свайго поля. Мой бацька таксама пабудаваўся на сваім полі. Тады побач нас было толькі некалькі хатаў, а пасля забудавалася цэлая вуліца, — кажа Валянціна Клімовіч.

Дабрывада знаходзіцца непадалёк ад чыгуначнага пуці, які спалучае Гайнаўку з Чаромхай і таму яе жыхары мелі зручны доступ да пасажырскага транспарту. Многа людзей стала працаваць на чыгунцы і штодзень на цягніках даязджаць на працу.

— Калі цягнік адвячоркам затрымліваўся каля нашай вёскі, выходзіла з яго многа людзей. Найчасцей на чыгунцы працавалі нашы мужчыны. Мы, жанчыны, займаліся гаспадаркай і дабыткам. Аднак былі і жанчыны, якія знайшлі работу на чыгунцы, — гаворыць спадарыня Клімовіч. — Землі ў нас слабыя — пятага і шостага класаў і таму гаспадары вымушаны былі шукаць іншых крыніц утрымання сем'яў па-за сельскай гаспадаркай.

— Я таксама працавала на чыгунцы. Калі зранку ўправілася з дабыткам, ішла на працу. Сваю работу выконвала з задавальненнем, а запатрабаванне на рабочых было ў нас вялікае, — інфармуе Барбара Якімюк. — Зараз гаспадаранне з'яўляецца для нас, пенсіянераў, дадатковым заняткам.

Жывёлагадоўля

Толькі ў сямідзесятых гадах у Дабрывадзе была праведзена камасацыя. Пасля вайны жыхары вёскі не арганізавалі ў сябе калгаса і можа таму сацыялістычныя ўлады не паскорылі працэсаў ліквідацыі цераспалосіцы.

— У гаспадароў, што мелі больш поля, палоскі былі шырэйшымі. Калі ў нас было мала зямлі, палоскі былі вельмі вузкімі і цяжка было гаспадарыць, — успамінае Валянціна Клімовіч.

Пасля камасацыі жыхары Дабрывады разгарнулі гадоўлю быдла.

— У нас было пяць кароў і збожжа многа мы прадавалі. Бывала, што і па 10 тон бульбы здавалі. З гаспадаркі пабудаваліся мы і сельскагаспадарчыя машыны купілі, — гаворыць Ніна Яўдасюк. — Дадаткова шыла я каробкі.

Спадарыня Яўдасюк вучылася шыць каробкі яшчэ ў сваёй роднай вёсцы Войнаўцы. У Дабрывадзе модным было тканне покрываў на ложкі, чым займаліся амаль усе жанчыны. Вырабы, што выходзілі з іх ткацкіх станкоў, здабылі прызнанне ў знатакоў гэтай прафесіі.

— Я ткала покрывы, якія пасля паказваліся на выстаўцы ў Беластоку, — кажа спадарыня Валянціна Клімовіч. — З „Нівы" прыязджаў да нас Мікола Гайдук і фатаграфаваў мяне ля ткацкага станка. Я спачатку не згаджалася на такую фатаграфію, але ён пераконваў, што трэба паказаць нашу работу.

Вялікая вёска пусцее

— Вёска была прыгожая, а цяпер пастарэла. Маладыя параз'язджаліся па свеце. У мяне было чацвёра дзетак і ўсе павыязджалі, — тлумачыць Валянціна Клімовіч. — А апошнім часам многа старэйшых людзей стала ўміраць.

— Калі ў мяне была бяссонніца, я палічыла, што ў Дабрывадзе зараз сорак дамоў стаіць пустымі. Толькі ў наваколлі маёй хаты ў дзесяці дамах ніхто не жыве. Старыя ўміраюць, а маладыя выязджаюць у гарады. Сын мой паставіў новую хату на іншай вуліцы і яна таксама пустуе. Я нядаўна вярнулася з бальніцы і таксама хіба хутка пакіну дом пустым, — кажа бабуля Ніна Сідарук.

Засталося яшчэ ў вёсцы некалькі малодшых гаспадароў, якія гадуюць больш кароў і абрабляюць большы арэал поля. Аднак найчасцей на зямлі працуюць пенсіянеры і гадуюць па адной кароўцы. Ёсць у Дабрывадзе малодшыя жыхары, якія знайшлі работу ў Кляшчэлях і Чаромсе.

— Лугі ў нас павысыхалі пасля меліярацыі і трэба было іх выараць. Зараз, у асноўным, у гаспадароў ёсць па адной кароўцы. Самыя горшыя пясчаныя землі мы аблясілі, — гаворыць Валянціна Клімовіч.

Жыхары Дабрывады ў мінулым працавалі пры пабудове школы і магазіна.

— У нашай школе вялося навучанне на беларускай мове і я таксама хадзіла на гэтыя заняткі. Новы будынак школы і магазін будавалі мы яшчэ ў шасцідзесятых гадах. Школу ліквідавалі ўжо ў сямідзесятых гадах, а магазін працуе па сённяшні дзень. Хаця зараз вядзе яго прыватны ўласнік, астаўся той жа самы будынак прыстасаваны для гандлю, — кажа Барбара Якімюк.

Заязджаюць турысты

Пасля асфальтавання дарогі з Кляшчэляў даезд у вёску добры. Турысты прыязджаюць у агратурыстычную кватэру, якую вядуць Міхал і Міраслава Зіневічы. Непадалёк ад вёскі знаходзіцца лес, які прываблівае прыезджых.

— Турысты найчасцей прыязджаюць летам і тады можна ўбачыць іх у нашай вёсцы, — заяўляе Анна Зіневіч, якую сустракаю перад хатай. Брат яе ўпрыгожыў панадворак перад домам драўлянымі вырабамі. Круцяцца там крылы ветрака, а збоку стаяць кармушка для птушак і іншыя драўляныя аздобы.

— Турысты звяртаюць увагу на вырабы майго брата і часам заходзяць да нас, — дадае спадарыня Анна.

— Некалькі хатаў купілі ў нас людзі з Польшчы. Адзін дом купіў лекар з Познані, а іншы жыхар Седльцаў, — удакладняе Ніна Сідарук і расказвае пра ўпрыгожанні вясковых дамоў. Найбольш прыаздоблены дом з ганкам у цэнтры вёскі, каля скрыжавання вуліц. Людзі, якія прыязджаюць у вёску на адпачынак, глядзяць на яго з розных бакоў.

— Збудаваў яго Ян Смык, які працаваў на чыгунцы і нядрэнна там зарабляў, — тлумачыць спадарыня Ніна, якая таксама жыве непадалёк ад скрыжавання.

Прыгожыя аздобы бачу таксама на іншых драўляных хатках, збудаваных, хутчэй за ўсё, пасля вайны. У розных месцах вёскі і на панадворку аднаго гаспадара стаяць крыжы, якія ставілі жыхары дзеля аховы вёскі ад нячыстых сілаў і дрэнных людзей. Зараз, калі асобы невядомага паходжання ходзяць па вёсцы, некаторыя карэнныя жыхары сочаць за імі. Калі я фатаграфую панараму вёскі, выходзіць да мяне мужчына ў сярэднім узросце і пытаецца пра мэту майго прыезду.

— „Ніву" я ведаю, але навошта вам фатаграфіі, — дапытваецца мой суразмоўца і, атрымаўшы паясненне, вяртаецца ў сваю мураванку, якая вылучаецца сярод драўлянай архітэктуры.

Аляксей Мароз

З вёскі паехалі ў... вырай

У апошні час здаралася мне некалькі разоў прыбягаць на чыгуначны прыпынак Беласток-Стадыён разам з поездам і таму не было часу заўважыць ягонай еўрапеізацыі. Але вось нядаўна з'явіўся я там некалькі хвілін да прыезду поезда. І бачу, што шыльды прыпынка значна паменшалі. Але галоўнае: заміж дзвярэй і акон пачакальні цяпер на іх месцы суцэльны мур, аздоблены ўжо працамі мясцовых футбольных і паліты-канскіх фанатаў.

Ранішні поезд з Беластока ў Седльцы завітвае ў Бельск. Крыху пасажыраў сходзіць, крыху ўваходзіць, рэйкабус крыху хвілін чакае. Дрымотна. Раптам будзіць мяне бегатня-ламатня: малады мужчына кінуўся ў адсек вадзіцеля, каб той спыніў машыну на разгоне. Высвятляецца, што пасажыр выбраўся ў Беласток, а рэйкабус рушыў у адваротным напрамку...

Калісь чуў я расказ, як пасля вайны адна кабеціна выбралася ў сваё першае падарожжа поездам. Зайшла яна на станцыю Нараўка, стала, так як і іншыя, у чаргу за білетамі. Мужчына, што быў перад ёю, хутка заказаў:

— Гайнаўка туд' і сюд'!

Кабета не пачула пачатку фразы і калі настала яе чарга, паўтарыла пачутую абракадабру:

— Туд' і сюд'!

— Але куды? — спытаў касір.

— Туд' і сюд'! — не здавалася жанчына.

— Можа ў Гайнаўку?

— Ну а куды ж?!

Магчыма, што той цяперашні бяльшчанін палічыў цалкам натуральным, што з Бельска можна ехаць толькі ў Беласток, так як калісь з Нараўкі толькі ў Гайнаўку.

Калі рэйкабус са стрэлачным грукатам пакідае пуці бельскай станцыі, за акном відаць шэры снег. Аднак гэта свайго роду палімпсест, дзе белы снег прысыпаў чорны вугальны пыл, які з вугальнага склада каля элеватара вецер рассеяў у напрамку Студзіводаў.

У адсеку насупраць мяне прыселіся да кандуктара ягоныя знаёмыя, відаць, таксама чыгуначнікі. Гутараць па-польску, але калі пачынаюць абменьвацца нумарамі тэлефонаў, лічбы называюць па-тутэйшаму; відаць, служба ў іх такая, што не патрабуе ведання лічэбнікаў.

За Рыгораўцамі чыгуначнікі заўважаюць прыродны рарытэт, прыгожага лася, які, стрывожаны гукам машыны, кідаецца ад чыгункі ў малады лес. Яшчэ некалькі гадоў назад між Рыгораўцамі і Вулькай-Выгаўскай былі амаль голыя разоры пасадкі. Цяпер там ужо красуюцца маладыя і яліна, і хваіна, і дуброва... За свежым кормам з'яўляюцца казулі, ласі, а за імі прыйдуць тыя, каму кормам будуць казулі і ласі... Ці тады захаваецца там нейкі след ад працы чалавека, коней, валоў?..

Каля пяці гадоў таму ішоў я ад Сяміхоч да чыгуначнай станцыі Новы Нурэц. Дарога ўсё разгаліноўвалася, драбнела, зарастала травою і на канец прывяла ў зараснік. А там, між акружаных самасеем садовых дрэў, стаяла бетонная стэла з крыжам і кірылічнай эпітафіяй — помнік дакладна такі, як і на могілках. На могілках ставяць помнікі на месцах, дзе хаваюць целы пакойнікаў, а вось на нурэцкім хутары нашчадкі пакінулі помнік і на месцы, дзе асталіся душы іх продкаў. Цікава, ці на абшырных пасадках і самасеях, што выраслі на месцы, дзе „родны краявід, палоскі вузкія" — як пісаў паэт — астанецца многа слядоў ад мясцовай спадчыны...

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Прыпынак у Баравіках на фоне маладога лесу

Будынак для пасажыраў на прыпынку Сухавольцы перастаў выконваць сваю функцыю. З аконных праёмаў выбітае ўсё, што толькі можна было выбіць, цяпер настала чарга на ўнутраныя сцены, якія нейкія двухногія заўзятары даводзяць да стану друзу. Мабыць, праз дзесяць гадоў не астанецца там і следу па пасажырскім прыстанішчы.

Чыгуначная станцыя Кляшчэлі аддаленая ад мястэчка і рух там мінімальны. Дарэчы, царскія пракладчыкі пуцей абышліся так з многімі гарадамі, напрыклад, Сямятычамі і Мордамі. Драўляны будынак станцыі ў Кляшчэлях, мабыць, з'яўляецца помнікам дойлідства, але задбаць пра яго няма каму, вокны там забіты алюміневай бляхай. Крыху далей разбураны мураваны павільён; расклад друзу паказвае, што былі там вялікія вокны.

У Чаромсе на бакавых пуцях стаяць два саставы таварных вагонаў са скасаванымі ўлікавымі нумарамі; магчыма, што некалькі дзесяткаў гадоў таму ставілі іх па-суседску з пасажырскімі пуцямі, каб ад тадышняга шматлікага пасажырскага натоўпу засланіць эшалоны з савецкай ваеннай тэхнікай, якая напраўлялася ў Германію. За вагонамі вагоннае дэпо, якое, як хамелеон, прымае іржавую афарбоўку тых вагонаў і няезджалых рэек пад імі.

Чыгуначны прыпынак Баравікі з'яўляецца ўзорам прыкладнога сюррэалізму. Пешаходныя лабірынты з металічных бар'ераў, якія мелі засцерагаць пасажыраў ад пападання пад поезд, красуюцца рэзкімі фарбамі на акружаючым фоне; сумнявальна, ці хто-небудзь імі карыстаецца. З будынка для пасажыраў поўнасцю адвалена адна сцяна, дзвярэй няма, у вокнах з металічнымі кратамі пакінуты цэлыя шыбы.

Вонкавыя сцены чыгуначнага вакзала ў Сямятычах у колеры каракумаў прысыпаных перцам. Партал уваходных дзвярэй яскрава беленькі, на белі запісаны творчыя парывы маладзёнаў, якія не выходзяць далей за імёны іхніх знаёмых.

Ступаю ў будыніну, куды, як гаворыцца, і цары пехатою ходзяць. На сценах у кабінах — Еўропа: бліскучыя керамічныя пліткі графітнага колеру. Ніжэй сцен падлога з голага бетону з круглай дзірай пасярэдзіне.

У Бельск вяртаюся на аўтобусе. На бельскім чыгуначна-аўтобусным вакзале брыгада з трох работнікаў знімае краты, якія засцерагалі чыгуначныя касы; цяпер асталася толькі адна, перанесеная ў памяшканне былога газетнага кіёска. Зняўшы згаданыя краты з акон, адзін з рабочых разрэзвае іх так, каб пасля можна было спаяць іх назад; гэтых крат столькі, што можна будзе абгарадзіць панадворак ад вуліцы. Двух яго калегаў працуе так, быццам будавалі сацыялізм: то стаяць нерухома з кавалкамі крат, то зноў кідаюцца з імі наўскач да легкавушкі, быццам наглядаў за імі нейкі важны цівун.

У вакзальным будынку няма ўжо ніводнай крамы, толькі вісяць абвесткі прапануючыя наём вакзальных памяшканняў. Бо сам вакзал, які размясціўся пасярэдзіне горада, па сутнасці з'яўляецца вясковым у ім прыстанішчам, свайго роду консульствам вёскі ў горадзе, адкуль можна купіць білет-візу ў вёску. Вакзал запаўняе вясковае насельніцтва: моладзь, што вучыцца ў сярэдніх школах і пажылыя людзі, што афармілі справы ва ўстановах або зрабілі пакупкі ў гарадскіх крамах. Ім ужо ніякія крамы, апрача білетных кас, непатрэбныя; нешта на зуб купляюць у ларках побач.

За згортваннем вясковага насельніцтва і згортваннем вясковых прыпынкаў згортваецца і бельскі вакзал. Замест колішніх трох чыгуначных білетных кас працуе цяпер адна, замест колішніх трох аўтобусных кас цяпер працуе таксама адна. А калі і гэтыя касы стануць непатрэбнымі, непатрэбны стане і вакзальны будынак. Можа нейкі час спатрэбяцца яшчэ для транспарту вугалю чыгуначныя пуці. А калі і той вугаль саступіць экалагічным дровам, тады на роўным месцы чыгуначных пуцей можна будзе збудаваць узлётна-пасадачную паласу аэрадрома, а ў вакзале адкрыць гарадскі аэрапорт. Ці ж Ікар не марыў, так як і мы тутэйшыя, каб адарвацца ад сваёй зямелькі?

Аляксандр Вярбіцкі

З Гомельшчыны ў Кракаў

20-21 лютага 2006 года праходзіў візіт у г. Кракаў дэлегацыі дзелавых колаў Гомельскай вобласці, падрыхтаваны пры ўдзеле Пасольства Беларусі ў Польшчы. Беларускую дэлегацыю ўзначальваў намеснік старшыні Беларускай гандлёва-прамысловай палаты, генеральны дырэктар Гомельскага аддзялення БелГПП Васіль Старавойтаў. У склад дэлегацыі ўваходзілі таксама прадстаўнікі кіраўніцтва прадпрыемстваў Гомельшчыны: ААТ „Гомельскі падшыпнікавы завод", ЗАТ „Таніс", абутковага завода „Труд", ААТ „Рагачоўскі малочна-кансервавы камбінат", ААТ „Рэчыцкі тэкстыль".

Падчас сустрэчы ў Кракаўскай гандлёва-прамысловай палаце Васіль Старавойтаў і прэзідэнт Кракаўскай ГПП Анджэй Здэбскі падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве паміж дзвюма палатамі. У сустрэчы прымалі ўдзел таксама кіраўнікі эканамічных дэпартаментаў Маршалкоўскага ўпраўлення Малапольскага ваяводства і мэры г. Кракава.

Адбылася кантактна-кааперацыйная біржа з удзелам прадстаўнікоў беларускіх прадпрыемстваў і зацікаўленых супрацоўніцтвам польскіх фірм.

Бакі дамовіліся працягваць супрацоўніцтва і ў якасці наступнага кроку па яго развіцці прапрацаваць візіт дэлегацыі Кракаўскай ГПП і прадпрымальнікаў Малапольскага ваяводства Польшчы на III Гомельскі інвестыцыйны форум і выставу „Вясна 2006 у Гомелі", якія адбудуцца 24-26 мая 2006 года.

Прэс-служба Пасольства РБ

Хома ў Познані

З ініцыятывы Віталя Воранава з Беларускага культурна-асветніцкага цэнтра ў Познані, а таксама пасла Яна Піліпа Лібіцкага з кіруючай партыі Права і справядлівасць, прарэктар Эканамічнай акадэміі ў Познані вырашыў аб прыняцці на бясплатнае навучанне выключанай з мінскай вучэльні студэнткі Таццяны Хомы. У лісце прарэктара гаворыцца, што студэнтка цалкам звальняецца з платы за навучанне і просіцца даслаць у вучэльню патрэбныя для афіцыйнага афармлення дакументы. Такое рашэнне было прынята ў знак салідарнасці з выключанымі за палітычную і грамадскую дзейнасць беларускімі студэнтамі. Цяпер вядуцца перамовы з дзевяцю іншымі вышэйшымі ўстановамі Познані пра прыманне беларускіх студэнтаў у выпадку пасля-выбарчых рэпрэсій уладаў.

Інфармацыя БКАЦ у Познані

Рэдакцыя „Нівы" дзякуе ўсім асобам і ўстановам, якія павіншавалі нас з 50-годдзем.

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Гражынка і Грак

- 16 -

— Трэба пакінуць нейкі след па сабе! — Гражынка сядзела і ўзіралася праз акно на вераб'ёў, якіх грамадка мітусілася на сцежцы, выбіраючы са смецця штосьці паесці. Вочы Грака пайшлі следам Гражынчыных.

— Ага, праўда, што тыя вераб'і. Вылупяцца з яйка, навучацца лятаць, зносяць яйкі, выседжваюць. Гадуюцца, быццам дыхаюць. А што ад іх застаецца? Адно пёркі на ветры... — пафіласофску стаў раздумваць Грак уголас. — А што, маюць можа кніжку напісаць пра сваё жыццё? Кіпцікам па пяску!

— От, разумнік, навучыўся клікаць на камп'ютэры і здаецца яму, што кніжку сам можа напісаць. Дык што, Грак, пісаць-меш? Першы том: „Грак Потэр і паўнакроўны каціска спадар Шадар"?

Грак дзюбануў у люстэрка, зірнуўшы на свой раскрыты рот. Праўда, клікаць дык навучыўся, але мышкай цяжкавата — кіпці неяк саслізгваюцца, няма як яе ўзяць у далонь: лапка ў Грака худзенькая. Спрабаваў пару сваіх тэкстаў убіць у тэкст дзяўчынкі, калі яна пакідала на хвілю ўключаны камп'ютэр, дык, вядома, зараз жа ліквідавала тую бязглуздзіцу што паяўлялася ў радках невядома адкуль.

— А я і напісаў, пад мамінай справаздачай. Свае роздумы. Дыскету мама забрала на працу, дык можаш прачытаць на цвёрдым дыску, — Граку аж цёпла зрабілася пад пёрамі на грудзях — вось, якніяк, а разбіраецца на камп'ютэрных справах, падвучыўшыся з Гражынкай, якая ўжо другі год вывучае інфарматыку.

Пад мамінымі падлікамі ды рубрыкамі, якія яна доўга была набірала і правярала пару дзён, паявіўся Гракаў твор:

„Мае роздумы над лёгкасцю быту ў паветры. Напісаў Грак. У паветры лятаюць асобы, якія маюць шанц лятаць. Патрэбныя для таго крылы, цёплае апярэнне, лёгкія косці і ўяўленне, што можна лятаць. Лятаюць яшчэ матылі, мухі, стракозы ды самалёты. Калі ляціш, адчуваеш волю і радасць. Пакуль канецццццц".

— Які сорам, які смех! Дырэктар ледзь не лопнуў, убачыўшы маю справаздачу аб нашым прадпрыемстве!

— Мабыць, нялётны ён абсалютна! — прабурчаў у пёры Грак.

Міра Лукша

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Дэкламатары перад выступленнем

Чарнобыльскія калыханні

Пабываць на школьным дэкламатарскім конкурсе „Роднае слова" ў Нарве заўсёды цікава. У гэты раз свята наладзілі ў Міжнародны дзень роднай мовы — 21 лютага. У святочна ўпрыгожанай зале мне ўдалося налічыць сорак выканаўцаў — гэта трэцяя частка ўсіх навучэнцаў беларускай мовы ў школе і гімназіі. Палюбавацца родным словам прыйшло васьмёра бацькоў, дырэкцыя школы і гімназіі ды дома культуры.

Хоць справа не толькі ў лічбах, выступленні вучняў шчыра захапілі публіку, журы і ніжэйпадпісаную. З досведу ведаю, што выступленні ў сваёй школе найфайнейшыя, тут адсутнічае тое татальнае хваляванне і стомленасць, якія звычайна спасцігаюць на цэнтральным этапе.

Найярчэй паказаліся наймалодшыя выканаўцы. Яны ўсе атрымалі заслужаныя вылучэнні.

— На мой погляд, тут можна паставіць адны пяцёркі і шасцёркі, — кажа Іаланта Грыгарук, метадычны дарадчык па навучанні беларускай мовы. — Усе дзеткі старанна вывучылі тэкст, у іх цікавая падборка ды вялікая разнароднасць аўтараў. Ніводзін твор не паўтарыўся.

Старэйшыя дэкламатары таксама мелі рэпертуар дапасаваны да ўзросту і собскага характару. Любімыя аўтары гэта Якімовіч, Агняцвет, Крапіва, Шушкевіч, Вольскі, Адважны.

— І цікавая тут адна дэталь, — адзначае Іаланта Грыгарук, — вучні падрыхтавалі такія творы, якія рэдка гучаць на конкурсах. Гэта сведчыць пра вынаходлівасць настаўніцы Ніны Абрамюк.

Я таксама пад уражаннем падборкі твораў гімназістамі. Дзяўчаты (у гэтай катэгорыі не было хлопцаў) дэкламавалі аб чарнобыльскай катастрофе, роднай мове ды паэзіі. Як высветлілася, вершы пра Чарнобыль патрапіліся спантанна, па ўласным жаданні саміх выканаўцаў — кемлівай Алі Міранчук і ўражлівай Ані Порац. Першая падрыхтавала „Я зона" Міхася Стральцова, другая — „Чарнобыльскую калыханку" Адама Камароўскага. Такім чынам у Нарве адзначылі дваццатую гадавіну Чарнобыльскай аварыі, чорны дзень у гісторыі, з-за якога памерлі або пацярпелі тысячы дзяцей у Беларусі.

Добра і надзейна, калі моладзь сама падбірае такія вершы. Тут справа не ў прызах, толькі ў спачуванні!

* * *

Вось прозвішчы лаўрэатаў школьнага конкурсу „Роднае слова" ў Нарве, якіх вылучыла камісія ў саставе: Іаланта Грыгарук — старшыня, Дарота Шамборская, Марлена Русіловіч.

У катэгорыі I-III класаў:

I месца — Мартына Паскробка,

II месца — Марта Лапінская і Чарэк Ляшчынскі,

III месца — Кася Зубрыцкая.

У катэгорыі IV-VI класаў:

Гран-пры — Дзіма Дзімідзюк,

I месца — Дамініка Юшкевіч, Павел Асіпюк, Кшысь Грынявіцкі,

II месца — Агнешка Апольская,

III месца — Агнешка Анікіюк.

Гімназія:

I месца — Магда Дудзіч, Уля Рашкоўская, Ала Міранчук,

II месца — Малгажата Харкевіч,

III месца Аня Порац і Мар'янна Садоўская.

Узнагароду „Зоркі" — кампакт-дыск гурту „Зніч" атрымала Магда Дудзіч, а ўзнагароду Іаланты Грыгарук — Уля Рашкоўская.

Зорка

Галерэя „Зоркі” (Дубіны)

Паўліна Паскробка

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Сярэдняя ацэнка на пасведчанні: 5,4.

Мая мянушка: „Кропка”.

У жыцці хачу стаць, чаму: настаўніцай, бо хачу вучыць дзяцей.

У сяброў цаню: шчырасць і весялосць.

Не люблю: асоб, якія гавораць няпраўду.

Па-беларуску размаўляю: з бабуляй і дзедкам ды настаўніцай на ўроку беларускай мовы.

Мой любімы гурт: „In-Grid”.

Каля свайго дому пасаджу: многа кветак і дрэў.

Тры Паўліны і Паўл

— А-я-яй! А-я-яй! — даносіўся стогн з пакоя Паўла. Гімназіст ляжаў ніцма на канапе як авечая шкура. Здавалася, праз момант памрэ.

— Мо, хуткую дапамогу выклікаць? — прапанавала маці.

— Ой, не, не! — застагнаў сынок, — лепш мне дайце нейкую пілюльку, паляжу, пагрэюся і ўсё пройдзе.

Спадарыня Бяроза ківала з літасцю галавой і глядзела на бацьку. Той моўчкі ўглядаўся ў бледны твар сына і моршчыў бровы. Хвароба Паўла не падабалася яму. Тым больш, што гімназісту безупынна званілі сябры і таксама заяўлялі пра хваробу.

— Ужо сёмая асоба, — інфармаваў бацькоўшчыну хворы, — ужо восьмая...

Пасля дзвюх гадзін хворых назбіралася ўжо больш за дваццаць. Бацька, вядома, знюхаў тут нейкую штуку, і нервова хадзіў па хаце.

— Як так захварэць раптам, — здзіўляўся ён, — і так оптам...

— Час такі, — бараніла сынка маці, — ад грыпу не схаваешся.

— Я бачу тут іншыя хованкі, — даказваў спадар Бяроза...

Памыляецца той хто думае, што Паўл хаваўся ад грыпу. Наадварот, увесь клас здорава запрацаваў на хваробу. А справа выглядала так. Пад канец карнавалу нашы сябры разам з Амеліяй Гурко наладзілі куліг. Ужо за горадам, калі пабачылі гурбы і заснежаны лес, на галовы гімназістаў наляцела неўтаймаваная фантазія.

— Я хачу стаць снежнай бабай, — заявіў на ўсю моц Паўл. Ён скінуў куртку і шапку ды зарыўся ў паўтараметровую гурбу снегу, адкуль выставала адна галава. Ідэя прынялася з ходу, асабліва спадабалася яна Паўліне Ш. і Паўліне Б. Дзяўчаты рушылі ў атаку і чырвонай памадай памалявалі сябру губы і нос. Прыклад падзейнічаў як эпідэмія. Усе хлопцы мігам захацелі стаць снегавікамі і снежнымі бабамі. Марцін і Алесь скінулі боты і басанож коўзаліся па лёдзе. Матфей загадаў пахаваць усе шалікі і рукавічкі, Тамаш распрануўся да майкі і штонікаў і, таксама як Паўл, зарыўся ў снег.

З-за эйфарыі, якую выклікала гульня, настаўніца ледзь змагла прывесці ўсіх у парадак і адправіць дадому. Праўда, яна, як і бацькі, зразу не знюхала канспірацыі. Калі на наступны дзень у класе „ўспых” грып, Амелія Гурко ўміг сцяміла ў чым справа. Для гэтага хапіла прыгадаць свае маладыя гады і ўсялякія штучкі, каб „наклікаць” хваробу.

Так ці інакш, „эпідэмія” ў класе доўжылася адзін дзень.

Дзень пазней гімназісты з запалам расказвалі пра тэрапеўтычныя рэпрэсіі, якія сустрэлі іх з боку бацькоўшчыны.

— Бацька канфіскаваў у мяне мабільнік, — расказваў Паўл.

— А мне, — сакатала Паўліна Ш., — забаранілі хадзіць на мастацкі гурток. Апошняя інфармацыя падзейнічала як нешта прыгнятальнае, гэта абазначала адно — канец *гніцця* з маладзёна „Філіжанкі”.

Арабінка

Польска-беларуская крыжаванка № 10



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 6: Бор, вока, хор, анёл, масла, адліга, ровар, канава, паласа, радок, садок, патрон, дама. Схованка, альт, брама, адрас, слова, каліва, нага, рад, аркада, кола, дом, музыка.

Узнагароды — аўтаручкі — выйгралі: **Кася Тарасюк, Рафал Скепка, Юстына Тэслюк** з Дубін, **Крыстыян Дунда** з Арэшкава, **Юліта Кананюк, Паўліна Лук'янюк** з Нарвы, **Куба Сухадола, Марта Бірыцкая, Беата Русакоў** з Нараўкі, **Наталля Янцэвіч, Паўліна Башун, Дыяна Капытка** з Чыжоў. Віншуем!

Вершы Віктара Шведа

Няма казак пасля шлюбу

— Ты, мой татулька любы,
Скажы мне, калі ласка,
Чаму заўсёды шлюбам
Канчаюцца ўсе казкі?

А тата за хвілінку
Адказ дае адразу:
— Бо пасля шлюбу, сынку,
Няма ніякіх казак.

Цягнік паехаў у Еўропу

На чыгунцы гарадской мясціны
Пасажыр кіраўніка спытаў:
— Той цягнік, што быў перад хвілінай,
Куды ён так хуценька памчаў?

— У Еўропу той цягнік паехаў.
— Адкуль ведаеце вы аб тым?
— Не хлушу, было б гэта грэхам,
Не спыніўся ён у нас зусім.

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Найважнейшыя грошы

— Калі ў тваім быў я ўзросце,
Ты сыночак мой харошы,
Выдавалася мне штосьці —
Найважнейшыя ў жыцці грошы.

— Ну а сёння па-другому,
Думае татуль каханы?
— Сёння я зусім свядома
Ужо аб тым перакананы.

У сям'і адны свінні

— Думаю, што мне адкажаш хіба,
Ты ж такі разважлівы, разумны:
Чаму дзік прыходзіць пад сядзібы,
Заўсягды так надта хмуры, сумны?

— Як жа, дружа, яму весяліцца,
У якой шчаслівы ён галіне?
Чым, скажы, ён можа ганарыцца,
У сям'і ягонай адны свінні.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Аня Пашко

Пытанні не былі цяжкімі

Да раённых элімінацый Прадметнага конкурсу па беларускай мове, якія 16 лютага праходзілі ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы, прыступіла ажно 73 гімназісты з 11 школ. У гэтым годзе вучні не памесціліся ў актавай зале і 16 асоб пісала конкурсны тэст у суседнім класным кабінеце. Сярод удзельнікаў конкурсу найбольш было вучняў з Бельскай і Гайнаўскай белгімназій, але прыехалі таксама гімназісты з Беластока і іншых больш аддаленых мясцовасцей. Вучні згодна гаварылі, што сёлетнія заданні не былі складанымі, але трэба было ўважліва чытаць указанні да іх, каб не зрабіць памылак.

— Заданні да тэсту не былі цяжкімі і толькі трэба было крыху задумацца перад пісаннем адказаў. Нават добра атрымлівалася мне складанне прыказак з раскінутых слоў. Матэрыял па граматыцы таксама не быў складаным. Займаліся мы з ім на занятках беларускай мовы, — кажа Ніка Якімюк. — Аднак на ўроках я больш люблю чытаць апавяданні і займацца літаратурай. Зацікавілі мяне расказы нашай настаўніцы аб бежанстве і мінулым.

У тэсце быў матэрыял датычны твораў Янкі Купалы, Максіма Багдановіча і дзейнасці Францыска Скарыны. У вучняў спраўджаліся гістарычны матэрыял пра наваколле і знаёмства з беларускімі часопісамі.

— Тэст не быў цяжкім для вучняў, якія знаёміліся з беларускай літаратурай, лексікай і граматыкай, прадугледжанымі праграмай навучання ў гімназіі, — сказала старшыня конкурснай камісіі Вольга Сянкевіч, якая дадала, што конкурс праходзіў згодна з усімі патрабаваннямі і застаецца чакаць абвяшчэння вынікаў.

— Лёгка было пісаць пра паходжанне назвы вёскі Трывежа, бо аб гэтым мы чыталі ў нашай кніжцы, — гаворыць Эвеліна Прабуцкая. — Рыхтуючыся да конкурсу, вучыліся мы ўсяго пакрысе. Я многа чытала пра Статуты Вялікага княства Літоўскага і добра зрабіла, бо на конкурсе была задача аб іх. Аднак на ўроках я найбольш люблю аналізаваць літаратурныя творы.

У тэсце гімназісты мусілі выказацца веданнем беларускай мовы. Перакладалі яны сказы з польскай мовы на беларускую і выконвалі практыкаванні, у якіх спраўджалася веданне беларускай лексікі. Вучні складалі прыказкі і пісалі пра стравы, якія спажывалі ў час калядзнай вячэры. Гімназісты падбіралі сінонімы, тлумачылі значэнне слоў ці вышуквалі лексіку звязаную з апрацоўкай ільну.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Гімназісткі былі згодныя, што тэст не быў складаным — справа: Паўліна Дзмітрук-Лапінская, Эвеліна Прабуцкая, Эдыта Хіліманюк і Эвеліна Келбашэўская

— Мне найцяжэй было растлумачыць значэнне слоў датычных мінулага і абрадаў, але ў агульным не было цяжка справіцца з тэстам, — кажа Эдыта Хіліманюк. — Рыхтуючыся да конкурсу, я звяртала ўвагу на творы вядомых беларускіх пісьменнікаў, якія мне спадабаліся.

Многа матэрыялу ў працах тычылася граматыкі. Гімназісты выконвалі практыкаванні на займенніках, скланялі назоўнік, устаўлялі знакі прыпынку і прапушчаныя „у" або „ў".

— Я найбольш вучылася па граматыцы і рада, што была задача са скланеннем, — заяўляе Паўліна Дзмітрук-Лапінская. Эвеліна Келбашэўская інфармуе, што таксама многа вучылася па граматыцы і любіць яе.

— Што тычыцца граматыкі, то ўсё можна паўтарыць перад конкурсам, а літаратуру не заўсёды дачытаеш, — гаворыць адна з удзельніц конкурсу, якую сустракаю на калідоры. — Напэўна не хацела б я, каб было больш матэрыялу па гісторыі Беларусі, бо я не гуманіст і мне цяжкавата засвойваць гістарычны матэрыял.

Гімназісты рады былі, што на падставе інфармацый разасланых па школах і замешчаных на сайце Куратораў ў Беластоку, маглі даведацца пра аб'ём матэрыялу, з якога пасля састаўляліся заданні да тэсту. Гэта абмежавала іх работу і дазволіла больш часу адвесці на працу з цяжкім для іх матэрыялам.

— Я не навучылася дастаткова пра Статуты Вялікага княства Літоўскага і таму задача на гэты конт была мне самай цяжкай. Увесь апошні матэрыял паказаўся мне аднолькава лёгкім. Рыхтуючыся да конкурсу я больш вучылася наконт гісторыі Беларусі і беларускай літаратуры. Многа матэрыялу па граматыцы я паўтарыла ў мінулым годзе, калі таксама рыхтавалася да конкурсу, — кажа Анна Грыгарук. — На ўроках беларускай мовы наш настаўнік стараецца зацікавіць вучняў матэрыялам з-па-за кніжкі. Найбольш я люблю, калі расказвае ён пра гісторыю нашых мясцовасцей і пра наваколле.

Пасля праверкі конкурсных работ аказалася, што 33 вучняў, якія набралі прынамсі 85% балаў (ад усёй колькасці магчымай да атрымання), было кваліфікаваных да ваяводскіх элімінацый.

— У агульным узроўні пісьмовых адказаў быў добры. Вучні паказалі, што добра ведаюць беларускую мову. Добра атрымаліся гімназістам заданні па гісторыі літаратуры і граматыцы. Крыху цяжэй было выконваць ім практыкаванні па лексіцы. Вучні, якія добра справіліся з заданнямі па абрадавай лексіцы, мусілі знаёміцца з вясковымі традыцыямі на ўроках, — сказала старшыня камісіі Вольга Сянкевіч. — Найбольш вучняў не ведала значэння слоў „радаўніца", „піліпаўка" або „асочнік".

Пераклад на беларускую мову аказаўся добрым, але паяўляліся русізмы. Карысталіся імі гімназісты, якія вучацца таксама рускай мове.

— Частка гімназістаў няўважліва чытала ўказанні да практыкаванняў і таму іх адказы не былі зусім згоднымі з патрабаваннямі. Вучням трэба больш уважліва чытаць указанні, бо ў час разнародных конкурсаў ці матуральнага экзамену, які іх чакае, будуць адымацца ў іх балы за незразуменне патрабаванняў, — заявіла Вольга Сянкевіч.

Некаторыя вучні не зразумелі як трэба правільна выканаць практыкаванне наконт прафесій Францыска Скарыны і таму гімназісты пісалі, што ён не быў друкарам. Частка вучняў расказвала пра паходжанне названня вёскі Трывежа некалькімі сказамі, калі трэба было напісаць толькі адзін. Хацелі яны паказаць свае шырокія веды, не падазраючы, што гэта можа быць успрынята адмоўна.

Аляксей Мароз

Дзіўная краіна і дзіўныя людзі

Вельмі часта чую розныя бязглуздзіцы на тэму Беларусі і беларусаў, якія выказваюцца як палякамі, так і самымі беларусамі. Паколькі невуцтва г.зв. звычайных людзей можна неяк апраўдаць, настолькі цяжка знайсці вытлумачэнне ў адносінах да адукаваных людзей. На жаль, сумленныя веды як у адных, так і ў другіх роўныя нулю.

Я, як свядомы паляк і аплачваючы падаткі грамадзянін, вырашыў паказаць майму сыну Літву, Беларусь і Украіну, каб не вучыцца яму гісторыі па міфах, якімі кормяць дзяцей у польскіх школах, каб даць яму магчымасць навочна пабачыць сучасных людзей і помнікі матэрыяльнай культуры Вялікага княства Літоўскага. Паехалі мы сям'ёй у Беларусь на экскурсію па слядах Адама Міцкевіча. У экскурсіі ўдзельнічалі перш за ўсё настаўнікі гісторыі і польскай мовы. Здавалася мне, што ў такім коле здабытыя ў ходзе гэтай захапляльнай экспедыцыі веды акажуцца больш поўнымі. На жаль, гэтыя людзі звярталі ўвагу толькі на сляды польскай культуры, а пра беларусаў яны нічога не ведалі і даведацца не стараліся. Папраўдзе, у Беларусі цяжка сустрэць беларуса на вуліцы. Пэўна па дамах яны ёсць, але мы там не заходзілі. Мяркуючы па трасянцы, якой яны звычайна карыстаюцца, можна іх палічыць расіянамі, аднак іх тыпова славянская, вельмі мілая знешнасць, без прымесі азіяцкіх рысаў, паказвае іх відавочную адметнасць. Зрэшты, большасць настаўнікаў і так думала, што знаходзіцца ў Расіі, хаця Беларусь увогуле непадобная на сваю ўсходнюю суседку.

Калі мы былі ў манастыры ў Жыровічах, нашым праваднікам быў праваслаўны святар, які ўвесь час гаварыў на прыгожай беларускай мове, чаго я ад яго дамогся. Ніколі я не чуў такой мовы. Усе дасканала яго разумелі. На жаль, пропаведзь у царкве была сказана ўжо на рускай мове. Прыйшлося тады сабе ўсвядоміць, што беларускага праваслаўя ў Беларусі няма. Гэты святар быў адзіным рэальным беларусам, якога мы сустрэлі, не лічачы прадаўшчыцы ў магазіне ў Навагрудку. Адазвалася яна да нас па-беларуску, пабачыўшы, што апрача мяне, жонкі і сына нікога ў магазіне не было. Дзіўная гэта краіна і дзіўныя там людзі. Яны ёсць і быццам іх няма.

Мой сын пасля вяртання сцвердзіў, што беларусы — гэта мая выдумка, бо ён сам іх не бачыў. Цяпер ведаю, што трэба нам паехаць туды яшчэ раз.

Здзіслаў Ліпскі, Варшава

Вось такія былі пачаткі „Нівы”

- 11 -

Размова з Георгіем ВАЛКАВЫЦКІМ.

— „Ніва”, як і ўсе выданні прэсавага канцэрна ПАРП, як успамінаеце ў „Споведзі старога рэдактара”, была пад партыйным наглядам...

— Але мы не працавалі па кіўку зверху.

— Вы сказалі, што „вас кідала ў жар”, калі нехта прабаваў умешвацца ў рэдакцыйныя справы; Вы ведалі, што разбіраецеся найлепш у іх, чым хто-небудзь звонку. Мабыць, не раз Вы „кіпелі”, хоць для калектыву былі „сілай спакою”. Як з Вашай памяццю — найлепш памятаюцца штуршкі, ці можа забываюцца, як прывідны сон, ці ў Вашай, усяго калектыву, працы памятаюцца тыя святлейшыя плямы? Памяці Вам, здаецца, можна пазайздросціць. Не ўсе ведаюць факты, шмат сведкаў ужо ў патойбаковым свеце, і ўзнікаюць легенды. Перажылі Вы ўсёўладных кіраўнікоў, якіх Вы прызнавалі, але не заўсёды слухалі. Здабылі Вы тытул „жалезнага рэдактара” за свае 32 гады рэдактарства.

— Памяць, так сказаць, суперселектыўная.

— Хачу ў Вас спытацца, як сведкі пераломных момантаў, таксама ў жыцці іншых, ці сапраўды гэтак было, як цяпер некаторыя ўспамінаюць? У кожнага, мабыць, селектыўная памяць... Цікавіць мяне, ці на славутым індэксе, які паказаў Вам цэнзар Гаёс, былі прозвішчы беларусаў? Якіх было нельга друкаваць у „Ніве”, так як і ў іншых часопісах і кнігах у Польшчы, не ўспамінаць па радыё і тэлебачанні?

— Беларусаў не было ў гэтым спіску.

— Сакрата таксама?

— Не было ў гэтым спіску Сакрата Яновіча. Дарэчы, парпаўцы тлумачыліся перада мною, што хацелі справу зрабіць паціху, каб не патрактавалі яе як справу супраць беларускай меншасці. На бэгэкатоўскім сходзе...

— Вось, ходзяць, нават у друку, розныя версіі: што Яновіч „выйшаў з БГКТ”, другая — што яго выкінулі.

— На бэгэкатоўскім сходзе аб Сакраце Яновічу не ўспаміналі. Калі ў Беласток на пасаду першага сакратара Ваяводскага камітэта ПАРП з'ехаў Здзіслаў Куроўскі, я выбраўся да яго, каб выведаць пра ягоныя планы і намеры таксама і на наш конт ды зрабіць інтэрв'ю. Тады ён адразу спытаўся пра Сакрата Яновіча, што ён робіць, якія былі ў яго праблемы з працай. Быў ён у той час старшынёй Праграмнай рады выдавецтва „Іскры”, дзе складзеная была да друку кніга Сакрата Яновіча. Спытаўся, ці я за тым, каб тую кнігу ён рэкамендаваў. Вядома, што так! Дарэчы, наконт інтэрв'ю, спытаўся, ці я... ужо яго маю! Бо раней прыходзіў да яго рэдактар С. з гатовымі ўжо пытаннямі і... адказамі першага сакратара!

— Мабыць, такія былі звычаі, што ўкладваліся слушныя словы ў вуснах розных „першых”... І як, разведалі, што ў маладога партыйца Куроўскага наўме наконт беларускай культуры, якая Вам заўжды ляжала на сэрцы? Ён быў нетутэйшы паляк, пэўныя справы можна было яму тлумачыць прасцей?

— Я яму і патлумачыў, што „характэрнай рысай Беласточчыны з'яўляецца багацце рэгіянальнай культуры”. Спытаўся я аб яго думку аб рэгіянальным грамадска-культурным руху. Ведаў ён пра дыферэнцыяцыю культуры рэгіёна пагранічча некалькіх культур. Звярнуў увагу на дбайнасць над развіццём народнага мастацтва, прапанаваў агульнапольскае штогадовае мерапрыемства — фестываль народных творцаў, пленэры. „Для ўсіх бачу тут месца, у тым ліку і для БГКТ” — адзначыў сакратар. „Калі хочам развівацца, мусім выкарыстаць усе магчымасці. Гэта павінна быць амбіцыяй усяго грамадства”.

— Спытаўся, як Эдвард Герэк, ці „паможаце”? Вы далі абяцянне, „што ў гэтай дзейнасці не будзе бракаваць і калектыву «Нівы»”. Вы, хоць „жалезны” рэдактар, які моцна трымаўся перад начальствам і строга пільнаваў, каб газета ні разу не спазнілася, значыць, дысцыпліну трымаў і ў журналісцкай грамадзе, прынцыпова адзначалі ў „стопцы”: „Рэдагуе калектыў”. А ці трымаліся разам запанібрата з калектывам? Успамінаюць м.інш. Сакрат Яновіч ды Уладзімір Паўлючук, што Вы не прымалі ўдзелу ў кампанейскіх сустрэчах, якіх не бракавала ў маладым і пругкім гурце? Не той тэмперамент?

— Я ж практычна „рабіў” на двух штатах. Калі пасля абеду хлопцы маглі дазволіць сабе пасядзець і пабяседаваць у мілым гурце, я пёр у друкарню, дзе, бывала, сядзеў да поўначы. Мы ж не мелі і тэхнічнага рэдактара да 1973 года.

— Частка журналістаў, мабыць, і не ведала, як той тыднёвік робіцца, якая гэта „чорная” работа. Цяпер гэта выглядае зусім інакш — бачыце ў нас у рэдакцыі, як „чыста” „пячэцца” друк. З таго першага складу ў нас, у новай рэдакцыі, якой якраз стукнула паўвеку, часта бываеце і Вы, і Міхась Хмялеўскі, які зусім лёгка ў свае гады перасеўся за сучасны камп'ютэр, і Марыся Федарук, машыністка, можна сказаць, ніўская „маскотка”, якую мы як найдаўжэй „трымалі”, як працяг традыцыі (славутая пані Марыся, якая і добры кавалак часу вяла сардэчныя парады, і ніхто як яна не ўмела адчытаць паэзію і прозу Барскага). Мы вельмі рады, што Вы з намі, што пішаце, выдаеце кнігі ўрэшце свае, навыдаваўшы „чужых”, выводзіўшы іх аўтараў на ніву роднага слова. Не лягчэй было б сабе пайсці на спакайнейшую пасаду?

— Прапанавалі мне былі спакайнейшую і больш платную працу. Адмовіўся. Пачуў: „Ну, а хто на тваё месца?”

— Вы жартуеце: „развязвайце рэбус як хочаце, але тое, што я трапіў у лік даўгавечных рэдактараў, не мая заслуга”. Ды гэта была...

— Так, вернасць „Ніве”. Я па-за ёй не бачыў сябе.

— Вы калісьці сказалі, у „журналісцкай удачы многа бацькоў, а рэдактарская рука выступае ў ролі нявідкі”. А прыйшоў быў такі час, калі Вы, спакутаваныя тромбафлебітам, у адзін лістападаўскі дзень 1987 года, убачылі ў дзвярах супрацоўнікаў з кветкамі.

— Вось так: дзяліў я з імі пары вы і згрызоты, не вызнаваў фаварытызму. Пяць год „перастарэў”. Быў галоўным 32 гады.

— Не пакінулі Вы нас і ў час нашых згрызот. У час, калі мы, ашчаджаючы на сваіх пенсіях (цяпер нас судзяць за тое, што мы адымалі сабе ад вуснаў), каб „Ніва” як і ў Ваш час, не спазнілася ды ўвогуле выходзіла, і Вы пісалі нам без ганарараў. Вялікі дзякуй за падтрымку. Тым больш, што ў цяжкі час падтрымлівалі Вы нас і словам дасціпным, як Сідар Макацёр, які шмат пабачыў за сваё жыццё ды ўсё ўмее смяяцца. Ды і вершы пішуцца. Вы ўсё ж той самы „літаратурны работнік”. Праўда, цяпер у моднай куртцы ад унука ды ў джынсах. І як тут старэць?!

— У зоркавай зроены гонцы,
Скаваны інертным вітком,
Мы ўсе спадарожнікі Сонца,
Трасемся адным чаўнаком.
Парыпвае капсула хілая
На разворотах крутых.
— Куды трасецеся, мілыя?
— А сам ты трасешся куды?

Размаўляла Міра Лукша

(ці цярпенні маладога Іванкі)

Год ужо, як заўважаю ў сябе асінхронію паміж псіхічнымі патрэбамі і фізічнымі магчымасцямі. Якраз столькі часу прайшло ад з'яўлення першых сімптомаў маёй хваробы.

Калі ў першым і другім класе ліцэя не меў я ніякіх цяжкасцей з заваяваннем дзявочага сэрца і атрыманнем усіх не прывабнасцей, за якія мужчыны часцяком кладуць галовы, то ў трэцім класе пачало псавацца, а цяпер, у чацвертым, дык справы выглядаюць цалкам дрэнна. Цябе, Сэрцайка, можа здзіўляе мой малады ўзрост, калі я перажыў сваю эратычную ініцыяцыю, але я выглядаю на старэйшага, чымсьці ў сапраўднасці. Хаця я і не надта высокі, але шырэйшы ў плячах за сяброў, а да таго галіцца пачаў у першым класе ліцэя, а ў трэцім загадаваў даволі густую бародку. Густаваў я заўсёды ў дзяўчатах старэйшых, для іх палавыя зносіны не навіна, ды і навучыць нечаму ў гэтых справах могуць. На парозе так добра пачатага эратычнага жыцця мне і не снілася, што так хутка наступіць трагедыя. Першыя прызнакі маёй (баюся нават гэтага слова) імпатэнцыі выступілі ў пачатку верасня мінулага года. Быўшы на вяселлі ў сваёй сваячкі, пасля танцаў давялося мне адводзіць дзяўчыну, не ўзяў да сэрца. Віну за маю слабасць злажыў на гарэлку, якую на вяселлі за каўнер не выліваў.

Аднак праз два тыдні я таксама не спраўдзіўся. Аб гарэлцы цяпер і мовы быць не магло, бо ўсё адбывалася ў школе на перапынку. Быў я дыжурным разам з класнай прыгажуняй, на якую даўно ўжо меў ахвоту. Перад урокам геаграфіі мы павінны былі развесіць у класе карту. Апынуўшыся за шафамі, дзе знаходзяцца карты, я пачаў дзейнічаць. Не спаткаўшыся з супраціўленнем, пайшоў на цэласць, але наеўся толькі ўстыду і ад таго часу ўцякаю ад яе насмешлівага позірку. Тут зноў знайшоў сабе тлумачэнне — віну скінуў на тое, што спяшаўся, і на незвычайныя абставіны, у якіх тады апынуўся.

халі да бабулькі на вёску і аставілі вольную хату на цэлую ноч. Гулялі мы весела. Я аднак алкаголю не піў (ано кілішак шампанскага за сваё здароўе) ды ўсё танцаваў з дзяўчынай, якую запрасіў дзеля мэты аднае. У разгады гульні мы непрыкметна пакінулі кампанію і апынуліся ў маім утульным пакойчыку, дзе ўсё было загадзя падрыхтавана. Прывабная пасцель, здавалася, толькі і чакала нас. Прыемнае святло і музыка „Дорсаў“ стваралі непаўторны, чароўны настрой. Калі мы цесна абняліся і, абсыпаючы сябе гарачымі пацалункамі, паваліліся ў ложак, я адчуваў сябе, быццам малады бог. Аднак мой прыўзняты настрой апус-

ціўся разам з маім... Я гвалтоўна сарваўся з ложка і галюсенькі ўскочыў у туалет, закрыўся, схапіў брытву і двума рухамі падрэзаў жылы. Але памерці мне не далі. Канікулы былі добрым часам, каб прыйсці ў сябе. Найлепш на маю псіхіку падзейнічалі Бяшчады і адзінокія шпацыры па горах. У школу вярнуўся, здаецца, здаровы. Заўважыў, што дзяўчаты зноў мяне цікавяць, але страх за цела паралізуе ўсе мае крокі ў іх напрамку.

З сакавіка вы павінны ў размовах пачаць размаўляць па-беларуску. А потым сказаць усім, што сёння — Дзень Беларускага Адраджэння...

www.treba06.narod.ru

У шэрагу краін падтрымка і ўмацаванне пазіцый роднай мовы ёсць адным з галоўных накірункаў дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры. На жаль, гэтая звычайная з'ява не тычыцца Рэспублікі Беларусь, дзе вуснамі пакуль дзеючага на пасадзе кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі было заяўлена, што „людзі, якія гавораць на беларускай мове, не могуць рабіць нічога, акрамя як гаварыць на беларускай мове, бо па-беларуску нельга выказаць нічога вялікага". І такім чынам, галоўная дзяржаўная мова пераўтварылася ў падчарыцу сённяшняй улады ў Беларусі. Казаць аб тым, што гэтая ўлада стане зацікаўленай у развіцці беларускай мовы залішне. Але, як гаворыцца, святое месца пустым не бывае. Ініцыятыву на сябе бярэ грамадства, дакладней, яе актыўная і неабыякавая да ўласнага жыцця частка.

Адным з праяўленняў такой ініцыятывы можна назваць адзначэнне Дня Беларускага Адраджэння, які прызначаны на 3 сакавіка. У Інтэрнэце з гэтай нагоды з'явіўся адмысловы сайт пад назвай „Трэба'06". Каб на яго зайсці, неабходна набраць на сваім камп'ютэры адрас: http://www.treba06.narod.ru .

Пры ўсёй павазе да распрацоўшчыкаў і натхняльнікаў сайта, варта адзначыць, што выглядае ён на даны момант даволі сціпла. На цёмнасінім фоне першай старонкі месціцца своеасаблівая адозва, якая заклікае адаслаць SMS пецярым сябрам з прапановай размаўляць па-беларуску цягам цэлага дня 3 сакавіка. Таксама тут распавядаецца пра сутнасць акцыі Дня Адраджэння, які, магчыма, стане штомесячнай традыцыяй. „Сутнасць акцыі нескладаная: 3 сакавіка (а потым 3 красавіка, 3 траўня і г.д.) вы павінны ў размовах з сябрамі, у краме, на працы раптам пачаць размаўляць па-беларуску. А потым сказаць усім, што сёння — Дзень Беларускага Адраджэння. Можна патэлефанаваць сваім бацькам, калегам па працы і павіншаваць іх са святам, такім чынам у гэты дзень кожны, хто любіць нашу мову, здолее паведаміць аб гэтым іншым".

Рубрык на сайце вельмі мала. Дакладна кажучы, іх усяго тры: „Далучыся!", „Абмеркаваць" і „Прапановы". Усе яны размешчаны не столькі для прагляду, колькі для актыўнага ўдзелу наведвальнікаў сайта.

Рубрыка „Далучыся!" гаворыць сама за сябе. У ёй кожны інтэрнэтны вандроўнік, які падтрымлівае акцыю, мае магчымасць далучыцца да яе хаця б віртуальна. Нягледзячы на невялікую прыцягальнасць гэтага аматарскага сайта, лічба тых хто далучыўся да акцыі праз яго набліжаецца да тысячы асоб.

Старонка „Абмеркаваць" нагадвае звычайны форум, якіх мноства ў Інтэрнэце. Тут маецца магчымасць выказаць сваё стаўленне да акцыі ў цэлым.

Ну і апошняя рубрыка „Прапановы" змяшчае нешматлікія пакуль выказванні наведвальнікаў сайта аб спосабах больш выразнага правядзення Дня Адраджэння. Даволі цікавай падаецца прапанова правядзення беларускамоўнага флэш-моба на пошце, дзе б да акенцаў цягам 15-20 хвілін падыходзілі б людзі і замаўлялі нейкія паслугі па-беларуску.

Зразумела, з большага падобныя акцыі ёсць нічым у параўнанні з тым, што магла б зрабіць дзеля ўмацавання пазіцый беларускай мовы дзяржаўная ўлада ў Беларусі. Але маем тое, што маем. І таму варта падзяліць погляд стваральнікаў данага сайта: Мы любім Беларусь, дык давайце зробім ёй падарунак!

Уладзімір Лапцэвіч

Біятланісты цалкам праваліли спаборніцтвы. Нават у эстафеце, дзе беларусы прывучылі свет да таго, што змагаюцца за прызы, атрымалася поўнае фіяска...

Беларусь, беларусы...

Як з белых гульняў дым...

Парафразуючы паэта, можна сказаць — пройдзе ўсё як з белых гульняў дым... Турынская алімпіяда застанецца ў памяці масаў заўзятараў толькі асобнымі фрагментамі. Імёны чэмпіёнаў і прызёраў зафіксуюцца ў энцыклапедычных даведніках, тых, хто не дабраўся да п'едэстала, праз гады забудуць. Усяго ж медалі заваявалі прадстаўнікі 26 краін (у тым ліку 21 дзяржава Еўропы). Найбольшымі трыумфатарамі алімпіяды сталі: Нямеччына — 29 узнагародаў, ЗША — 25, Канада — 24, Аўстрыя — 23, Расія — 22, Нарвегія — 19. Падкрэслім, што немцы па колькасці здабытых медалёў становяцца лепшымі ўжо трэція гульні запар.

Беларусь таксама адзначылася ў ліку лаўрэатаў. Абышлося без асаблівых нечаканасцей. Нашы суайчыннікі выступілі ў сваю рэальную сілу. Найбольшага поспеху, як і прагназавалася, дасягнулі фрыстайлісты. У фінальны спабор, куды кваліфікуецца тузін мацнейшых лыжных акрабатаў, сярод жанчын трапілі Асоль Слівец і Ала Цупер. Абедзве выступалі і на папярэдняй алімпіядзе — Асоль тады была трынаццатай, Ала — пятай. 23-гадовая Слівец дасягнула зараз лепшага выніку ў сваёй кар'еры — сумарнае 5-е месца. Цупер лічылася рэальнай прэтэндэнткай на медаль, але пры выкананні першага скачка ўпала, выправіць агульную сітуацыю далей было немагчыма. У выніку ўдзельніца трох белых алімпіяд спынілася на 10-й пазіцыі.

Куды вышэйшымі былі стаўкі нашых мужчын-фрыстайлістаў. У дванаццаць мацнейшых свету выйшлі ажно трох беларусаў — Дзмітры Дашчынскі, Аляксей Грышын і Антон Кушнір. Самым лепшым чынам выявіў сябе дэбютант алімпіяды Кушнір — у яго 8-е выніковае месца. Грышыну суддзі аддалі чацвёртае месца, якое безумоўна засмуціла бронзавага прызёра Солт-Лэйк-Сіці. Ну а Дашчынскі (бронзавы лаўрэат Нагана) здабыў на гэты раз срэбны медаль, хоць на думку многіх экспертаў быў варты чэмпіёнскага тытулу. Арбітры, аднак, аддалі пальму першынства кітайскаму спартоўцу, які выконваў менш складаныя скачкі.

У апошні дзень адбыўся мужчынскі лыжны марафон. На дыстанцыю 50 км выйшла восемдзесят мацнейшых лыжнікаў свету. У гэтай процьме ўдзельнікаў не згубіліся і беларусы. Аляксандр Лазуткін у выніку апынуўся ў сярэдзіне — выніковае 40-е месца. А вось „шматпакутны" Сяргей Далідовіч, які ўрэшце атрымаў дазвол стартаваць, здолеў выявіць свае моцныя якасці. Змагаючыся да апошняга, ён стаў дванаццатым, хоць адставанне ад пераможцы склала толькі 10 секунд.

Мужчыны-біятланісты цалкам праваліли спаборніцтвы. Нават у эстафеце, дзе беларусы прывучылі свет да таго, што змагаюцца за прызы, атрымалася поўнае фіяска — толькі 11-е месца. Гонар айчыннага біятлона ўратавалі жанчыны. Да апошняй стральбы чацвёртага этапа эстафеты яны ішлі на трэцім месцы, але не здолелі яго ўтрымаць. У выніку наш квартэт (Кацярына Іванова, Вольга Назарава, Людміла Ананька, Алёна Зубрылава) стаў 4-ым.

З пункту гледжання афіцыёзнай прапаганды, у цэлым наша дружына выступіла няўдала. Калі ж ацэньваць айчынны патэнцыял цвяроза, то свой агульны ровень беларусы пацвердзілі. У неафіцыйным камандавым заліку (ачкі налічваюцца за траплянне ў васьмёрку) Беларусь апярэдзіла суседнія Украіну, Латвію, Польшчу, а таксама многія іншыя краіны Еўропы.

Уладзімір Хільмановіч

Таямнічыя коды

Пасля таго як ужо амаль заснуўшы пасля нуднай начной змены памежнік падскочыў на сваім крэсле, толькі з тае прычыны, што Павел прасунуў у вузенькае акенца яго цёплай памежнай будкі свой пашпарт, пасажыры халоднага аўтобуса, які рухаўся праз мяжу з Гродна ў напрамку Беластока, зразумелі — сёння ім не патрапіць своечасова на сваё працоўнае месца продажу кантрабанднага алкаголю і цыгарэтаў на беластоцкім рынку. Праўда, калі той памежнік куляй, як голы ў лазню, паляцеў з Паўлавым пашпартам у другую цёплую будку, дзе сядзела яго кіраўніцтва, у сэрцах няшчасных пасажыраў аўтобуса яшчэ цеплілася надзея, што гэта затрымка з-за нейкай нязначнай дробязі, што непаразуменне хутка вырашыцца і яны патрапяць хаця б на канец гандлю. Але калі зноў убачылі свайго памежніка, які плёўся ў хвасце дэлегацыі з трох памежнікаў, трох мытнікаў і аднаго нізкарослага, але задзёртаносага чалавека ў цывільным, усё стала зразумелым — хутка выбары, а ў аўтобусе апазіцыянеры. Алярм! Праверка будзе безвыніковай, але доўгай. Нічога не знойдуць, але нервы папсуюць. Урэшце ўсіх адпусцяць, але на рынак ужо ніхто не паспее.

— Вазьміце свае рэчы і ідзіце з намі, — лянівa звярнуўся да Паўла адзін з мытнікаў, молячы ў думках Бога, каб нічога незаконнага ў тых рэчах не было, бо, замест таго, каб пасля заканчэння працы паехаць у цеплыню нагрэтага жонкай ложка, прыйдзецца цэлы дзень пісаць паперы, а вечарам тлумачыць усё той жа жонцы, што яго позняе вяртанне да сямейнага ўтулку адбылося не з-за каханкі і не з-за гарэлкі. (І тое, і другое яго жонкай аднолькава ўспрымалася як самае вялікае злачынства свету. Яна так і не магла, за доўгія гады шчаслівага сямейнага існавання вызначыцца, што горш).

Павел узяў свае рэчы, кінуў позірк на Алеся, другога ў тым аўтобусе апазіцыянера і паслухмяна, як баран на бойню, пасунуўся ўслед за прадстаўнічай памежнай дэлегацыяй.

Торба была пустая, як кішэні алкаголіка. Яе праверылі ўсе па-чарзе, а чалавек у цывільным аж некалькі разоў. Яго твар свяціўся паляўнічым азартам з тае забавы. Хацелася штосьці знайсці. Ды дзе там. Як у тую торбу сам нічога не пакладзеш, то нічога і не знойдзеш. Апазіцыянеры народ бывалы. Праз мяжу нават вошай не рызыкуюць перавозіць.

Паўла прыйшлося адпусціць. Пасажыры аўтобуса, і нават памежнікі з мытнікамі, уздыхнулі з палёгкай. Засмуціўся толькі чалавек у цывільным. Ён яшчэ раз праверыў прозвішчы пасажыраў, адклаў убок цяпер ужо Алесеў пашпарт, і яго твар зноў засвяціўся паляўнічым азартам.

Далей падзеі пайшлі так, як бы хтосьці на відэамагнітафоне націснуў клавішу „паўтарыць". Усё тая ж дэлегацыя з трох мытнікаў і трох памежнікаў ды аднаго ў цывільным, усё тое ж расчараванне на тварах пасажыраў, усё той жа лянівы голас паўтарыў тыя самыя словы: „Вазьміце свае рэчы і ідзіце з намі". Другая серыя ад першай рознілася толькі тым, што мытнік звярнуўся не да Паўла, а да Алеся. Усё гэтак жа, паслухмяна, як баран на бойню, Алесь пайшоў услед за прадстаўнічай памежнай дэлегацыяй. Такая сама нудная праверка торбы і... раптам у сцэнарыі памежнага серыяла нечакана памяняўся сюжэт — у торбе быў нататнік. А ў нататніку...

Сярж. Зінк. 2(7), 5(9), 3(8) — 10+24=34

Яўг. Кап. 4(6), 7(9) — 11+15=26

І так цэлы нататнік. На тварах памежнікаў і мытнікаў роспач — дахаты сёння не патрапяць. І надзея — а можа той у цывільным нічога не разбярэцца ў тых таямніча закадаваных надпісах і апазіцыянера адпусціць. А ў таго выраз твару мяняўся з кожнай хвілінай. Напачатку радасць, ад якой вочы заблішчэлі мацней, чым медаль, які меркаваў атрымаць за затрымку „дзяржаўнага злачынцы". Пасля злосць, што ў тых надпісах не толькі ён, але і лепшыя кадавальшчыкі КДБ не разбяруцца. У канцы страх. Раптам сапраўды не разбяруцца. Тады яму не толькі медаль не свеціць, але ён стане пасмешышчам усёй заходняй мяжы. Халера б іх пабрала, тых апазіцыянераў. Як кадаваць навучыліся! Прыйдзецца адпускаць.

Уздых палёгкі мытных супрацоўнікаў суправаджаўся бурлівай радасцю пасажыраў аўтобуса, які нарэшце вырваўся з моцных лапаў Радзімы.

— Чаго так доўга трымалі? — спытаўся ў Алеся хтось з пасажыраў.

— Да нататніка прычапіліся, — усміхнуўся той. — Але як зразумелі, што разабрацца ў надпісах не змогуць, страцілі да мяне цікавасць.

— А пакажы тыя надпісы нам.

Алесь паказаў нататнік і пачуццё захаплення талентам апазіцыянераў да шыфравання, перамешанае з павагай да іх інтэлектуальных здольнасцей, ахапіла ўсіх, нават шафёра.

— Вось дык шыфроўка! Дзе так можна было навучыцца. Хіба ты праходзіў курсы ў ЗША, — пацікавіўся той.

Аўтобус заціх у чаканні геніяльнага адказу, вартага інтэлекту чалавека, які здольны на такія таямнічыя коды.

— Якая шыфроўка? — здзівіўся Алесь. — Гэта не шыфры, а скарачэнні. Я спартовы журналіст. Занатоўваю вынікі спаборніцтваў. Напачатку стаіць скарочанае імя і прозвішча. Пасля лічбы галоў і пасаў. І нарэшце сума, якая і вызначае спартовы рэйтыг.

Генрых Западашмянскі

У Нарве народная выстава

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Ян Паскробка і Станіслаў Паскробка

Гмінны цэнтр культуры ў Нарве, дзе і бібліятэка, сарганізаваў багаты паказ творчасці народных мастакоў з усяе гміны. Аб некаторых з іх пачуў ужо вялікі свет, хоць яны „аматары" (як мастак Станіслаў Паскробка з Рыбакоў і Эва Алімоўская, працаўніца ГОК, паэтэса, мастачка ды спявачка), іншыя працуюць над сваім варштатам похапкам, адпачываючы ад работы, цешацца сваімі вырабамі і час ад часу паказваюць на такіх выставах, дарююць іх знаёмым. Няўвыклыя яны да тэлекамеры, як разьбяр з Лапухоўкі Пятро Іванюк, ніколі, здаецца, не разважалі над істотаю мастацтва ці яго гісторыяй. Малююць, прабуюць пісаць іконы, выпальваюць, рэзьбяць у драўніне, вяжуць гаплючком, рупліва вышываюць ці гафтуюць на тканіне. „Między dawnymi i nowymi czasy" — як паэтычна падагульвалася выстаўка — яны працягваюць традыцыю, сучасна яе асэнсоўваюць без вялікай навукі. Не заўсёды гатовыя паказвацца — заданне працаўнікоў ГОК знайсці гэтых дамарослых артыстаў ды прывезці ў гміну, паказаць іх красу сярод іншых народных рупліўцаў. А што захапляе так, каб пачаць самому ствараць? Родная прырода, краса прынарваўскіх краявідаў, кветак, людзей, вера...

— Я ў войску быўшы пачаў разьбярыць, рабіць інтарсію, маляваць. А навучыўся ў прафесіянальнай школе ў Гайнаўцы працаваць з драўнінай, — кажа Пятро Іванюк. — Я сам сваіх вырабаў не паказваў. Прыехалі з ГОКу — хтось падказаў, што я раблю штосьці ў сваёй Лапухоўцы.

— Як я пачаў разьбярыць? Унучцы выразаў сякерку драўляную для забавы, пасля — яна з-пад Рыбаў — рыбку... — успамінае Ян Паскробка з Цімахоў, солтыс на Цімахі і Гайдукоўшчыну. — Зайкаў, грыбкоў, дзікіх гусей. Буслоў. У гміне мала дзяцей, дык хай хоць сімвалічна падмогуць... Каб войт не наракаў! Раблю гэта дзеля свае прыемнасці. Ранічкай устану, як сон не бярэ. Звечара прышыкую з грубшага сякеркай, раніцай запалю святло, акуляры надзену і паціху займаюся разьбой. І радасці крыху, і час неяк сыходзіць. Не нудзіцца ў жыцці, а ёсць нейкае задавальненне. А вось тут — мастак больш вядомы, а жыве ад мяне праз мяжу, у Рыбаках: Стась Паскробка.

— Цяжкая экзістэнцыя, — прызнаецца рыбакоўскі мастак. — Адно толькі, што чалавек малюе, гэта палёгка. Гэта ратуе.

Народныя мастачкі — перш за ўсё жанчыны, якія заўжды знойдуць час, каб яшчэ па-свойму ўпрыгожыць свет. Люба Анапюк, Надзея Плясковіч, Галена Шварц, Надзея Нікалаюк з Ласінкі, Аляксандра Чэрнякевіч з Макаўкі, Крыстына Русачык, Галена Куптэль і Эва Алімоўская з Нарвы, Надзея Амельянюк з Трасцянкі, Вольга Свентухоўская з Тыневіч-Вялікіх, Бажэна Тэслюк з Гародчына, мужчыны — Ян Андрасюк з Прыбудак, Марыюш Снарскі з Гарэндаў, Аляксандр Анішчук з Козлікаў, Лукаш Грынявіцкі, Генрык Твароўскі, Пятро Іванюк, Ян і Станіслаў Паскробкі... Адкрыццю выставы спадарожнічалі спевы ды танцы — гайнаўскай „Перапёлкі" ды Магды Дудзіч і Мажэны Русачык, ды багаты частунак рэгіянальнымі вырабамі.

— Культура гэта капітал, які можна выкарыстаць дзеля развіцця гміны, — на ўступе заўважыла дырэктар ГОК. Пацвердзіў гэта па-беларуску і войт Якуб Садоўскі, для якога выстава народнага мастацтва была нагодай пахваліцца і іншымі гміннымі дасягненнямі. **(лук)**

І ад мяне некалькі слоў пра Дзуна

Вельмі добра і праўдзіва напісаў пра Васіля Дзуна Віктар Бура, трапна напісаў пра яго і Мікалай Варанецкі. Васіль Дзун наведаў Дубічы-Царкоўныя некалькі разоў недзе ў 1970-х гадах, калі ў нас яшчэ дзейнічаў гурток БГКТ. Помню, як у зімовы вечар у нашай святліцы Васіль Дзун выступіў са сваімі ўспамінамі пра гісторыю беларускасці на Беласточчыне. Людзей у зале было шмат і ўсе з цікавасцю і павагай слухалі ягоных расказаў. Ён умеў нескладанай мовай і свайго роду літаратурнай прыцягальнасцю зацікавіць слухачоў. І помню, як ён пачаў з памяці дэкламаваць колішнія беларускія вершы, а памяць ён меў дасканалую; на заканчэнне кожнага твора ён атрымліваў гучныя апладысменты ад нашых людзей. І помню, як адзін наш, дубіцкі селянін Іван Чыквін (дзядзька нашага літаратара Яна Чыквіна) таксама з памяці прадэкламаваў беларускі верш з „Маланкі" і таксама атрымаў за гэта заслужаныя воплескі.

Пасля заканчэння сустрэчы я запрасіў Васіля Дзуна да сябе ў госці; быў гэта памятны вечар у маім жыцці. Вельмі многа я даведаўся тады ад яго, як трэба шанаваць роднае слова і сваіх людзей. І яшчэ аднойчы Васіль Дзун наведаў мой дом, прывёзшы з сабою беларускі каляндар. Быў з ім тады малады хлопец, як я здагадаўся, ягоны прыёмны сын. Варанецкі напісаў, што Дзуну нявыгадна было гаварыць па-польску і па гэтай прычыне мы амаль сваякі, бо і мне гэта не надта клеіцца. У мяне ён у вялікай пашане, бо быў ён адукаваным чалавекам вялікага сэрца.

Мікалай Панфілюк

Худзенькі бюджэт Чаромхі

15 снежня 2005 г. адбылася XX сесія Рады гміны ў Чаромсе, у час якой быў адобраны праект бюджэту на 2006 год.

Сёлетні бюджэт складае суму 9 075 904 зл. на баку прыбыткаў і 10 745 905 зл. на баку расходаў. Дэфіцыт 1670 тыс. зл. будзе пагашаны банкавым крэдытам (1540 тыс. зл.) і вольнымі сродкамі.

На інвестыцыі гміна прызначыла 5 486 104 зл., на цякучыя выдаткі — 5 259 800 зл. У 39% інвестыцыі будуць фінансаваны з датацыі, 29,4% — з субвенцый дзяржаўнага бюджэту. Уласныя задачы гміна будзе рэалізаваць у 10,5% з датацыі, 8,9% — з падаткаў і 11,8% складаюць астаткі з прыбыткаў. Камунальная гаспадарка паглыне 24,6% бюджэту, сельская гаспадарка — 24,1%, асвета і выхаванне — 21%, сацыяльная дапамога — 9,9%, публічная адміністрацыя — 8,8%. На падкормліванне ў школах, у гэтым ліку на харчаванне найбольш патрабуючым дзеткам прызначаецца 50 тыс. зл.

Асноўнымі інвестыцыямі з'яўляюцца: пракладка асфальтнага палатна на дарозе Зубачы — Баброўка, разбудова ачышчальні сцёкаў пры насычальні, пабудова санітарнай каналізацыі на вуліцах Фабрычнай і Бочнай, пабудова такой жа каналізацыі на адрэзках вуліц Сасновай, Падлесьнай, Спартовай, Польнай, Грунтовай, Галэмбяй і Круткай, мадэрнізацыя вулічнага асвятлення на энергаашчаднае. Афармленне дакументацыі. Як у мінулым годзе, так і сёлета гміна пакарыстаецца еўрасаюзнымі сродкамі.

Уладзімір Сідарук

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1 700 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2006 r. upływa 5 marca 2006 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na II kwartał 2006 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwar. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Połud. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

Мікалай Панфілюк

Плённы юбілей

Паўвеку таму выйшла „Ніва",
Бо наш народ немаўклівы,
Што хадзіў цярністай дарогай,
Захацеў роднага слова.

Шлях наш быў размаіты,
З радасцей і клопатаў звіты,
Найбольш у ярме няволі
Глядзелі мы лепшай долі.

Былі сярод нас патрыёты,
Што вывелі нас з дрымоты,
Паставілі буйную мэту:
Сваю выдаваць газету.

Каб захаваць сваю мову,
Насеяць родныя словы,
Загоны рыхліць нашых ніў
Рэдакцыйны стаў калектыў.

Калі пачалася вясна
І крыху паднесла цяпла,
Вырасла „Ніва" на славу,
Цветам заззяла яскравым.

І скора радочкі „Нівы"
Напоўніў змест гаманлівы,
А побач подыхам свежым
Натхняла нас „Белавежа".

Наша жыццё забурліла
Новай духовай сілай.
Прыйшоў залаты юбілей —
Бярэмся за справу жывей!

Дзень за днём

Прамінае дзень за днём —
Так мы праз жыццё ідзём.
За намі чарговы месяц,
Зоркі ў небе далей свецяць.

Здаецца, усё нармальна...
А ці да роднага ставімся пахвальна?
Ці даражым дараванай нам мовай,
Ці хаваемся з ёю перад Богам?

Наша мова гучыць прыгожа,
Памілуй і захавай яе нам, Божа.
Каб дар Святога Духа завітаў
Не толькі на запечак, але ў храм.

Пара ўжо родным ганарыцца,
Сваёю мовай пахваліцца.
Мінае год і пакідае нам свой плён,
За гэта Богу аддамо нізкі паклон.

Будзь, новы годзе, прыгажэйшы,
Хай кожны з нас будзе духам мацнейшы.
Трымаймася надзеі, веры і любві,
Хай Божай ласкі нам свецяць прамяні.

Родныя краявіды

Фота УЛАДЗІСЛАВА ЗАВАДСКАГА

„Даўціпы" Андрэя Гаўрылюка

Між сяброўак:

— Чаму ты парвала заручыны з нарачоным?

— Бо перастала кахаць яго.

— А чаму не вярнула яму шлюбнага пярсцёнка.

— Бо да яго мае пачуцці нязменныя.

* * *

Гутараць дзве сяброўкі:

— Ці не думаеш выходзіць замуж?

— Бо я ведаю? Ужо колькі разоў мяне прасілі...

— А хто цябе прасіў?

— Ну, бацькі.

* * *

Між французамі:

— Ад чаго б ты найперш адмовіўся: ад віна ці ад жанчын?

— Гэта залежала б ад даты вытворчасці.

* * *

Ксёндз спавядае парафіянку:

— Ці не спала ты, дачуся, з чужым мужам?

— А ці, ваша вялебнасць, чужы мужык дасць паспаць?

* * *

У рэстаране:

— Афіцыянт, — кліча спажывец, — гэтае віно цёплае!

— Гэта немагчыма! Хвіліну назад даліваў да яго халодную ваду.

* * *

— Афіцыянт, што за рабак плавае ў маім супе?

— Не ведаю. Я заўсёды меў клопаты з урокамі біялогіі.



Адгаданка

1. сталіца з Вавелем, 2. мусульманскі князь, 3. газ з трох атамаў кісларoду, 4. жонкі і наложніцы мусульманіна, 5. партнёр жонкі, 6. кавалак кары дрэва ў выглядзе вузкай палоскі для выплятання лапцяў, 7. жонка Адама, 8. праём з шыбамі, 9. Фрыдэрык, польскі кампазітар (1810-1849), 10. рытуальная забарона, 11. недастатковы нагляд, промах, 12. лятучыя прадукты гарэння з коміна, 13. літаратурнае прозвішча Івана Дамінікавіча Луцэвіча, 14. мясцовасць падпарадкаваная адной уладзе ў Старажытнай Русі, гміна. **(ш)**

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — прымаўку.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 4 нумара

Вільня, Прая, муха, Венера, кніга, Уганда, корань, бяроза, пясок, ААН, дно, плод, вада, ярмо, дына, Ялта, вера, пяро, дуга.

Рашэнне: **У мяне вялікая ганьба: ногі няпарныя — адна правая а другая левая.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх і **Лявону Федаруку** з Рыбалаў.

5.03 – 11.03

Баран (20.03. — 19.04.) Старайся разумна глядзець на свет, не спяшайся з высновамі. Вораг поспеху — ілюзія і прадузятасці. Дбай аб страўнік, не еш цяжкатраўнага хлеба. Сны могуць хутка здзейсніцца.

Бык (20.04. — 20.05.) Шмат энергіі, якую варта добра накіраваць. Абдумай планы. Не рэагуй імпульсіўна. Абыходзься асцярожна з прыладамі. Можаш ачысціць арганізм, шмат п'ючы вады і сокаў.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Спачувай, не будзь абыякавым на крыўду людзей (бессардэчны сам неўзабаве апынецца ў патрэбе). Сны могуць здзейсніцца адваротна да сімволікі.

Рак (22.06. — 22.07.) Лёгка можаш заахвоціць людзей да супрацоўніцтва, паўплываць на іх. Пачаты праект можа прынесці відны поспех. Сон здзейсніцца праз месяц.

Леў (23.07. — 22.08.) Важная справа — аб'ектыўнасць. Моцныя эмоцыі выкарыстай для ўласнага развою. Адмоўныя эмоцыі „распрацуй", падумай, што з'яўляецца іх прычынай. Еш стравы „з вады", пазбягай мяса. Пасядзі пры вогнішчы, а прынамсі пры каміне ці свечцы.

Дзева (23.08. — 22.09.) Можаш мець схільнасць успрымаць усё пад уплывам уласнага настрою. Асцярожна з фізкультурай. Будзь асцярожны ў асабістых справах — можаш кагосьці пакрыўдзіць ці пакрыўдзяць цябе. Не паддавайся маніпуляцыі ці ліхім падшэптам.

Шалі (23.09. — 22.10.) Засяродзьцеся на справах важных для вас, звярніце ўвагу на дэталі. Гэта неўзабаве прынясе карысць. Варта падыходзіць без прадузятасцей да новых людзей і падзей. Будзьце прыязныя, ды захавайце сваю індывідуальнасць.

Скарпіён (23.10. — 21.11.) Больш зацікаўся новымі магчымасцямі. Добры час для кароткатэрміновых планаў. Звяртай увагу на вочы суразмоўцаў — з іх шмат можаш прачытаць. Дбай аб галаву, вочы, твар і горла. Пазбягай солі. Добры момант завесці знаёмствы ў новым асяроддзі.

Стралец (22.11. — 21.12.) Лёгка вучыцца, спалучаць факты, займацца справамі патрабуючымі зацятасці і кемлівасці. Добры час на публічныя выступленні. Пахадзі па яловым лесе. Пі ваду, якая пастаяла на сонцы і набрала яго энергіі.

Казярог (22.12. — 20.01.) Пазбягай лішняга высілку і ўсяго, што павышае ціск крыві ў арганізме. Адарвіся ад „страт", парві з фальшывымі сябрамі, хоць нават парванне са звычкай можа быць цяжкае. Адразу як прачнешся пі шклянку крынічнай вады.

Вадалей (21.01. — 18.02.) Кінь лішнія роздумы над пралітым малаком. Што не ўдалося, дык, мабыць, прапусціў, ды прыйдуць новыя шанцы. Пры аслаблым сэрцы пі ранкам ваду з лыжкай мёду — найлепш пастаў іх звечара. Чакай паправы творчай кан'юнктуры.

Рыбы (19.02. — 19.03.) Варта пашукаць адказу на важныя пытанні. Добрыя дні на экзамены, будзьце толькі „эластычнымі" ды дасціпнымі. Падбірайце словы, асабліва калі вы пад уплывам эмоцый. Калі ў душы сум, дазвольце сабе на ачышчальны плач. Калі маеце праблемы з асертыўнасцю, хтосьці мацнейшы можа спрабаваць узяць вас пад сваю ўладу.

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960

Ніва 50 ЮБІЛЕЙНАЯ

Ніўскі калектыў у 1986 годзе

Юбілей „Нівы”

Юбілейнай „Ніве” толькі пяцьдзесят гадоў. А можа можна і так сказаць, што аж пяцьдзесят гадоў з чытачамі. Столькі гадоў для беларускай газеты і то яшчэ па-за межамі Беларусі — падзея незвычайная. Некалькі пакаленняў беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы свой радавод і сваю беларускасць вызначала менавіта з нашай рэдакцыяй. Дзякуючы гэтаму ўжо ніхто сёння не можа перакрэсліць нашага беластоцкага, беларускага мінулага. А за будучыню трэба надалей усім пазмагацца. Журналісты „Нівы” на працягу гэтага перыяду часу, можна смела сказаць, выканалі рэч незвычайную — сталі летапісцамі пэўнай часткі беларускага народа, якому выпала жыць у сваёй Малой Айчыне — Беласточчыне. Тое, што напісана пяром, не вырубаць і тапаром — здаўна паўтаралі разумныя людзі. І людзі з асяроддзя „Нівы” зразумелі гэтае пасланне. Пасля заканчэння журналісцкай ці карэспандэнцкай актыўнасці не пакідалі яны пяра. Надалей дзейнічалі як літаратары і навукоўцы, настаўнікі і выкладчыкі, мастакі і мовазнаўцы, этнографы і фалькларысты. А пасля пераменаў 1989 года вызначылі сябе дадаткова палітыкамі, самаўрадавымі і грамадзянскімі дзеячамі, выдаўцамі. Толькі за апошні час Праграмная рада нашага тыднёвіка выпусціла больш за трыццаць выданняў літаратурна-гістарычна-публіцыстычнага кшталту. Усе людзі „Нівы” за ўвесь яе перыяд стараліся беларускаму дому ў Польшчы даць цвёрды нацыянальны падмурак. Дзякуй Вам усім за гэта.

„Ніва” нарадзілася роўна тры гады пасля смерці Сталіна. Таму, зразумела, трэба памятаць пра абавязваючую ў часы рэальнага сацыялізму ідэалагічную даніну і цэнзарскую пільнасць. Але ў публікаваных зараз успамінах першага галоўнага рэдактара „Нівы” Георгія Валкавыцкага мы можам адчуць атмасферу, у якой прыйшлося працаваць тадышнім журналістам. Атмасферу далёкую ад так прыгожа дэкларыванай сацыялістычнай дружбы польскага і беларускага народаў. Відавочна і ў самой ніўскай сям’і здараліся непрыемнасці, недаразуменні, крывадушнасці. Нягледзячы на ўсе вышэйуказаныя абставіны, у рэдакцыі заўсёды ў пашане былі самастойныя думкі і погляды. Галоўныя рэдактары — Георгій Валкавыцкі, Віталь Луба, Яўген Мірановіч — абсалютна разумелі, што найважнейшае ў працы беларускай рэдакцыі — гэта пачуццё сваёй незалежнасці і нацыянальнай годнасці. Таму дзверы рэдакцыі і старонкі „Нівы” заўсёды былі адкрыты „нацыяналістам” з Усходу і Захаду. Кожны, хто хаця раз дакрануўся да беларускага пытання ў Польшчы, не мог абмінуць рэдакцыйных парогаў. Часта людзі маглі не пагаджацца з напісаным у газеце, але не заставаліся абыякавымі да роднага слова з Беласточчыны. Майму пакаленню сённяшніх саракагодкаў таксама ў палове васьмідзесятых гадоў мінулага стагоддзя рэдакцыяй была дадзена магчымасць выказаць нам погляды на сваё адчуванне свету. Гэты шанц мы скарысталі.

А якой будзе будучыня? Лёс газеты заўсёды ў руках чытачоў. І мы верым, што застануцца яны з газетай надалей. Пры нагодзе застаецца папрасіць таксама Усявышняга, каб навучыў беларусаў шанаваць саміх сябе. Тады пра наступныя пяцьдзесят гадоў „Нівы” будзе можна думаць спакайней. Бо сёння ў выдавецкім і чытацкім плане не судовыя працэсы з’яўляюцца для нас найвялікшай праблемай, хаця справай вельмі крыўднай і балючай. Суды зараз неад’емная частка ўсяго беларускага лёсу і нацыянальнага пытання. Нацыянальны нігілізм гэтак званых адукаваных маламестачкоўцаў і гараджан — вось нашая бяда. Цяжка сабе ўявіць, каб у здаровым грамадстве былі такія факты, калі быццам бы „беларуская” ўлада і чынавенства публічна хваляцца тым, што ўвогуле не чытаюць „Нівы” і не падпісваюцца на яе ў свае асветна-культурныя ўстановы. Пры нагодзе чарговых выбараў беларускія выбаршчыкі такіх „сваіх” павінны адаслаць на заслужаныя пенсіі, каб нам больш не прыносілі сораму. Прытым дзесяткі гарлапаністых актывістаў надалей не ў змозе не пашкадаваць восем злотых у месяц і набыць газету ў кіёску ці падпісацца на яе на пошце. Некаторыя грашавітыя бізнесоўцы, юрысты, чыноўнікі, зайшоўшы ў рэдакцыю, ахвотны атрымаць „Ніву” і яе кніжныя выданні... але дарма. Жабрачая панскасць, спадзяемся, пераходная з’ява нашага часу і грамадства. Толькі вольныя людзі цэняць сваё роднае слова, якое не мае цаны. З імі надалей застаецца „Ніва” да наступных круглых юбілеяў.

Яўген Вапа

Рэдакцыі і Супрацоўнікам Тыднёвіка „Ніва”

Падзяка й хвала вам, прадаўжальнікам запачаткаванай 50 гадоў таму традыцыі й нялёгкай, але плённай працы!

Пяцьдзесят гадоў бесьперапыннага выхаду тыднёвае газэты — зьява ня частая ў беларускай гісторыі. „Ніва” заслужыла сабе годнае імя Летапісца беларускага жыцьця ня толькі Беласточчыны, але і ўсяе беларускае нацыі. На працягу першых дзесяцігодзьдзяў выхаду, калі Ўсход і Захад былі разьдзеленыя жалезнай заслонай, калі зацята гулі ў эфіры радыёглушылкі, калі амаль зусім зьнікла была надзея на сувязь з роднымі землямі, голас вашага тыднёвіка даходзіў да суродзічаў па цэлым сьвеце як сыгнал надзеі. „Ніва” даносіла праўдзівыя весткі з жыцьця на Бацькаўшчыне, сталася сьведчаньнем жывучасьці Беларускага Духу, слушнасьці нацыянальных дамаганьняў ды спадзяваньняў на іхную рэалізацыю.

У Злучаных Штатах „Ніву” выпісвалі, „Нівай” зачытваліся, „Нівай” ганарыліся, а прачытаўшы перасылалі суродзічу, паселенаму на другім канцы кантынэнту. Чытачы й дасюль прыгадваюць таленавітага гумарыста „Нівы” Дзядзьку Кваса. Сп-ня Зінаіда Станкевіч часта выкарыстоўвала матэрыял зь „Нівы” для рэдагаванага ёю дзіцячага дадатку „Каласкі” ў месячніку „Беларус”, што выходзіць і дасюль як орган Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня. Ніваўскія беларусаведныя артыкулы прыдаваліся культурным рэфэрэнтам для розных інфармацыйных патрэбаў і сьвяткавальных мерапрыемстваў. Вялікай папулярнасьцю карысталіся календары „Нівы”, напоўненыя бягучай і рэтраспэктыўнай тэматыкай. На выстаўцы ў Ньюёркаўскай Публічнай Бібліятэцы, наладжанай у 1967 годзе да 450-х угодкаў скарынаўскае Бібліі, быў пакладзены й беластоцкі „Беларускі Каляндар” як сьведчаньне трывушчай у нашай гісторыі выдавецкай справы. „Ніва” красавалася на вялікай выстаўцы беларускага друку ў тэй жа бібліятэцы з нагоды 100-годзьдзя народзінаў Янкі Купалы й Якуба Коласа ў 1982 годзе.

Людзі ў эміграцыі не заўсёды пасяляюцца адзін пры адным. Для ўсіх іх, але асабліва для тых, што жывуць раскідана, свая газэта, як свой чалавек — заходзіць у хату жаданым госьцем, дзеліцца супольнымі зацікаўленьнямі, аблягчае адзіноцтва, падтрымвае на духу.

За ўсё гэта тым, што ўзаралі й апрацавалі свойскую ніву, ды тым, што кідаюць далей зярняты ў родную глебу, належыцца прызнаньне й глыбокая ўдзячнасьць ад тых, хто пажынае каласы ды мацуецца духовай стравай.

Янка Запруднік, Нью-Ёрк

Рэдакцыі тыднёвіка „Ніва" на 50-я ўгодкі выхаду ў сьвет

Паважаныя Сябры!

Шчырае прывітаньне з днём 50-х угодкаў „Нівы" перасылае вам Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва ў ЗША. Вітаем вашага Юбіляра ня толькі як крыху малодшага сябру, але й як блізкага супрацоўніка ў гадох 1956-1960, калі БІНіМ узначальваў др. Вітаўт Тумаш, які пад псэўдонімам К. Стойлянскі інтэнсыўна ліставаўся з рэдакцыяй „Нівы" і дапамагаў у распаўсюджваньні ў ЗША вашай газэты ды вашых кніжных выданьняў.

Тыднёвік „Ніва" — пажаданы госьць у шмат якіх беларускіх хатах у Амэрыцы. Сардэчна зычым вам удачаў у вашай далейшай высакароднай працы.

З пашанай,

Вітаўт Кіпель
Старшыня Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва ў Нью-Ёрку

Дарагая „Ніва"!

Сардэчна віншую Цябе з паўстагоддзем, поўднем і поўняй быцця! За 50 гадоў на Тваіх старонках „узрасло" столькі цікавых і багатых на невядомыя раней факты артыкулаў і публікацый, што ўявіць сабе без іх гісторыю беларускай культуры ну аніяк немажліва.

Мне прыемна сёння прыгадаць, што 50 гадоў таму, атрымаўшы ад кагосьці са студэнтаў з Польшчы першы нумар „Нівы", я адразу пабег у рэдакцыю газеты „Літаратура і Мастацтва", каб паведаміць чытачам Беларусі пра радасную навіну — выхад першага беларускага тыднёвіка ў пасляваеннай Польшчы.

Адам Мальдзіс

Яніна Чарнякевіч: „Зорка" з Praktika-й

Легендарная „Зорка" з 31-гадовым стажам, наведала ўсе мясцовасці, у якіх навучалася беларуская мова. Сярод пакаленняў запамяталася яна як рэдактар з праменнай усмешкай і вялікім фотаапаратам. Здымкі рабіла найперш „Масквой", пасля фотаапаратам „Praktika", які важыў да пяці кілаграмаў.

У час сустрэч са школьнікамі апавядала пра жыццё газеты, вучні расказвалі пра сябе. Пасля дасылалі ёй процьму лістоў з допісамі, вершамі, апавяданнямі.

— За ўсе гады, — кажа спадарыня Яніна, — я старалася несці беларускую мову ў народ. Мне хацелася, каб беларуская мова трымалася. **(гак)**

Ада Чачуга: 32 гады з „Нівай"

— Успамінаць пра „Ніву" не маю чаго, бо я яшчэ з ёю звязана. Пра старыя часы ўспамінаем, але пры іншых нагодах. Што самае істотнае: калі б нават у мяне быў самы найгоршы настрой і хандра, калі я прыходзіла на працу і брала ў рукі тэксты, то ўсё станавілася на сваё месца, у душу ўлівалася радасць, бо чалавек мае для чаго жыць, бо нешта творыць, для людзей, якія нават, можа, адчуваюць сябе самотнымі ў рэчаіснасці, — каб яны адчувалі, што яны не адны, што „Ніва" з імі. **(лук)**

Дарога ў карэспандэнты

Марыя Яканюк і Віктар Бура

Было гэта дзесьці летам 1958 года. Спатрэбілася мне паехаць у Беласток. Сеў я ў Гайнаўцы ў цягнік і ў дарогу! У Беластоку ўсе справы пайшлі як трэба і я, вяртаючыся на чыгуначны вакзал, купіў у кіёску газету „Ніва". У зваротнай дарозе пагартаў я старонкі гэтага выдання, пакідаючы дэталёвае азнаямленне з ім на пазнейшы час. Праз пару дзён вярнуўся я да прачытання цэлага нумара. З гэтай пары купляю і чытаю „Ніву" кожны тыдзень, стала мне яна спажарожніцай жыцця.

Аднойчы будучы ў Беластоку пастанавіў я наведаць рэдакцыю, якая тады знаходзілася па вуліцы Весялоўскага, 1. Пры ўваходзе ў будынак вахцёр запытаў мяне куды я іду і да каго, а затым ветліва сказаў павярнуць управа. І вось перада мною цэлая рэдакцыя і ейнае начальства. Прынялі мяне тут вельмі шчыра, пасяброўску, пачаставалі гарбатай і пячэннем. Сядзеў я ў рэдакцыі, прыглядаўся і прыслухоўваўся журналісцкай працы. У гэты дзень я пазнаёміўся таксама з Георгіем Валкавыцкім — галоўным рэдактарам „Нівы". Высокі, прыстойны мужчына, з лагоднай усмешкай на твары, сказаў тады мне: „Будзеш карэспандэнтам".

Пакідаў я мілы ніўскі калектыў з запрашэннем часцей наведваць рэдакцыю пры нагодзе пабыўкі ў Беластоку. Запрашэнне было для мяне вялікі гонарам і пры кожным наведванні сталіцы ваяводства не абмінаў я рэдакцыю, пазнаваў там чарговых журналістаў. Галоўны рэдактар Георгій Валкавыцкі запрапанаваў мне пісаць у „Ніву", а Вера Валкавыцкая, якая апекавалася карэспандэнтамі, падбадзёрыла мяне, так сказаць дала „ўстаноўку", і каб я не саромеўся пісаць пад сваім прозвішчам параіла падпісвацца крыптанімам В. Б., а нават прыдумала мне псеўданім „Крыніца". У гэты шчаслівы для мяне дзень паабяцаў я ніўцам, што паспрабую што-небудзь напісаць. З таго часу пішу я карэспандэнцыі да сённяшняга дня.

Маё супрацоўніцтва з „Нівай" значна пашырылася, калі пачаў я працаваць штатным сакратаром Аддзела БГКТ у Гайнаўцы. На працягу 15 гадоў знаходжання на гэтай пасадзе я часта наведваў рэдакцыю, дзе распрацоўвалі мы планы сустрэч журналістаў з чытачамі ў вёсках і мястэчках Гайнаўшчыны. Якімі ж плённымі былі такія сустрэчы: днём у школах, а вечарам у клубах ды святліцах. Мне было вельмі радасна на ўсё гэта глядзець, любавацца як шчыра, з вялікай любоўю, з кветкамі сустракала іх школьная моладзь, настаўнікі, кіраўнікі клубаў са сваім народам. А колькі ж набалелых людскіх спраў дапамаглі сваім вострым пяром вырашыць журналісты „Нівы"! Рэдакцыю „Нівы" наведвалі журналісты з Беларусі, што было зручнай нагодай для ладжання з імі сустрэч у нашых школах і клубах.

Цікавыя і вельмі патрэбныя былі гадавыя сустрэчы ніўскіх карэспандэнтаў. Гэтага свята чакалі мы ўсе і ставіліся да яго з вялікай пашанай. Галоўны рэдактар Георгій Валкавыцкі лепшым карэспандэнтам года ўручаў каштоўныя ўзнагароды, пры гэтым быў абавязковы пачастунак. Такія сустрэчы памятаюцца доўга.

Тады журналісты моцна цікавіліся глыбінкай, многа пісалі пра жыццё беларусаў на вёсцы, пра асвету, самадзейнасць, сельскую гаспадарку, слаўных выхадцаў. Мне да сённяшняга дня памятаецца артыкул „Лётчык з вёскі Аднога".

Вялікім аўтарытэтам сярод школьнікаў карысталася рэдактар „Зоркі" Яніна Чэрнякевіч. Яна не толькі прыгожая, прывабная жанчына, але папросту адданы сваёй справе чалавек. Усе школы рады былі сустрэчам з „Зоркай", паколькі яна клапацілася, каб у кожнай школе былі беларускія падручнікі і дапаможнікі, часта прыходзіла ў дапамогу настаўнікам, публікуючы на сваіх старонках прыгодныя для выкарыстання на ўроках роднай мовы матэрыялы.

Тадышнія штатныя працаўнікі і актывісты БГКТ клапаціліся пра распаўсюджванне свайго органа „Нівы". Справай гонару для нас было, каб „Ніва" была ў кожнай школе, хаце, у кожным клубе. Памагалі нам у гэтым пісьманосцы, цяпер заслужаныя пенсіянеры. Гэта яны ў сваіх паштовых сумках разносілі штотыдзень дзесяткі і сотні экземпляраў „Нівы" ў амаль кожную хату, клуб, школу. А для чытачоў „Ніва" была жаданым госцем. Напрыклад, мая маці ажно да 92 года жыцця штотыдзень чакала ў пятніцу пісьманосца, які ў гэты дзень прыносіў яе любімую газету (яна любіла чытаць, асабліва „белавежцаў", а „Анну Карэніну" Льва Талстога перачытвала тройчы).

На вёсцы часта можна было пабачыць такую карціну, калі пісьманосец спыняўся пасярэдзіне вёскі, а вакол яго гуртаваўся натоўп чытачоў, якім той па чарзе раздаваў свежую „Ніву". Такіх багатых душою і сэрцам прапагандыстаў роднага слова было многа, але мне хочацца назваць адно прозвішча: Мікалая Панфілюка з паштовага аддзялення ў Дубічах-Царкоўных. Ён на сваіх плячах за 37 гадоў прафесійнай работы перанёс столькі экземпляраў „Нівы", што калі б усе гэтыя кілаграмы загрузіць на ягоны трактар „Уладзімірац", наўрад ці рвануў бы ён з месца...

Журналісты і карэспандэнты клапаціліся таксама пра распаўсюджванне беларускіх календароў і кніжак „белавежцаў" (некаторыя журналісты былі аўтарамі гэтых выданняў). Па сённяшні дзень ніўскія і бэгэкатоўскія выданні захоўваюцца ў публічных, навуковых і прыватных бібліятэках як свайго роду рарытэты, якія сведчаць аб літаратурнай актыўнасці беларусаў Беласточчыны.

Пускаю слязу, калі ўспамінаю колішняе сяброўства журналістаў і карэспандэнтаў „Нівы" з БГКТ. На ўсе мерапрыемствы, якія ладзіліся на Варшаўскай 11, запрашаліся журналісты, а на ўрачыстасцях, арганізаваных рэдакцыяй, прысутнічалі прадстаўнікі Галоўнага праўлення БГКТ. На бэгэкатоўскіх балях журналісткі на высокіх абцасах і журналісты пад гальштукамі танцавалі і спявалі разам з актывістамі, жадаючы сабе ўзаемна ўсяго найлепшага. Супрацоўніцтва квітнела на радасць усім беларусам.

За апошнія 50 гадоў напісаў я шмат карэспандэнцкай, якія публікаваліся на старонках „Нівы". Пісаў я пра свае вёскі, людзей, мінулае сваёй бацькаўшчыны, культурна-асветную дзейнасць у беларускім асяроддзі. Думаю, што ў сённяшняй „Ніве" замала такіх матэрыялаў, а замнога палітыкі. На маю, ніжэйпадпісанага, думку, нам усім трэба старацца, каб наш тыднёвік з кожным нумарам павялічваў свой тыраж, каб яго чыталі не толькі ў Кашаліне ці іншых гарадах Польшчы ці ў далёкім свеце, але і ў нас паўсюдна.

З нагоды 50-гадовага юбілею жадаю першаму рэдактару Георгію Валкавыцкаму моцнага здароўя, сонечных дзён. Гэтага ж самага жадаю былым журналістам — цудоўным людзям.

Многа здароўя шчыра жадаю старшыні Праграмнай рады тыднёвіка „Ніва" рэдактару Яўгену Вапу, а таксама ўмелай вытрымкі перад судовай пагрозай. Журналісткам і журналістам цяперашняй „Нівы" жадаю многа здароўя і ўсяго таго, што завецца добрым словам. За шчырыя адносіны да мяне дзякуе ніжэйпадпісаны карэспандэнт

Віктар Бура

Беларуская песня 2006

Дзень да юбілею пяцідзесяцігоддзя першага з'езду Беларускага грамадска-культурнага таварыства, пасля ўрачыстага сходу, адбыўся галаканцэрт, завяршаючы XIII фестываль „Беларуская песня 2006", у сваёй конкурснай гісторыі — XXXVIII. Сабралася ў спартыўнай зале спартклуба „Влукняж" традыцыйна ўжо пару тысяч гледачоў, сярод якіх былі і запрошаныя госці — прадстаўнікі адміністрацыйнай і самаўрадавай улады з Польшчы і ад кіраўніцтва ды дыпламатычных служб Беларусі. Як ні дзіўна, якраз у юбілейны год, VIPаў, здавалася, паменшала; хіба найбольш адчувалася, што не было Владзімежа Цімашэвіча, які заўжды спрыяў фестывалю перш за ўсё як чалавек улады. Затое падтрымалі фестываль (таксама ўзнагародамі) прадстаўнікі Падляшскага самаўрадавага сейміка, якога паўнамоцтвы канчаюцца сёлета; гэта, здаецца, апошні аплот палітычных кругоў, якія становяцца *не трэндзі* пры новым ветры гісторыі. Мабыць, „нямодным" цяпер наведваць будзе беларускія мерапрыемствы; можа, да наступных выбараў?.. Галоўнае, усё ж, што выбіраюць прыхільнікі роднай песні — знакамітых выканаўцаў, руплівых арганізатараў, шчырых дабрадзеяў, што не паскупяцца дакласціся да развою роднай культуры.

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Ян Сычэўскі, старшыня БГКТ і кіраўнік па справах культуры Падляшскага самаўрада, у кароткім уступе прыгадаў падзеі з гісторыі БГКТ — арганізатара мерапрыемства, намякнуўшы, што на працягу тае гісторыі былі розныя моманты нават не вельмі прыязных адносін з боку ўлад краіны і нетаалерантнасці людзей да нас. Затое, як адзначыў віцэ-міністр культуры Рэспублікі Беларусь Валерый Гедройц, які прывёз словы віншаванняў ад урада РБ і падарункі ад міністэрстваў культуры, адукацыі і замежных спраў (на фестывалі былі прысутныя і намеснікі начальнікаў розных міністэрскіх ведамстваў, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Народнага сходу РБ...) — шчыра дзякаваў тым, хто тут на Беласточчыне „так любіць беларускую мову і культуру ды мае такія заслугі ў зберажэнні духоўных каштоўнасцей беларускага народа".

Канцэрт спраўна вялі Ева Ласкевіч і Аркадзь Якімюк. Сярод пастаянных выканаўцаў, вядомых сваім талентам і песнямі, апынуліся і маладыя, новыя галасы — новы ансамбль „Лайланд" пад кіраўніцтвам Багдана Астапчука, хор „Загадка" з Супрасля пад кіраўніцтвам Міраславы Ціханюк (узнагарода Радыё Беласток — запіс песень у студыі), гурт „НуБоШто" з Варшавы, якім кіруе Анна Фіёнік (узнагарода Міністэрства адукацыі РБ), маладзёжнае трыо з Беластока (кіраўнік Анна Пятроўская), уключылі ў рэпертуар беларускія песні „Vegas" з Грабаўкі (кіраўнік Пятро Кажан) ды знакаміты польскі падляшскі народны гурт „Клекацякі" з Боцек (кіраўнік Марэк Скамароўскі).

Завяршылі канцэрт госці — Дзяржаўны прадстаўнічы танцавальны ансамбль Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам Валянціна Дуткевіча ды эстрадны калектыў „Сваякі" з Мазыра (кіраўнік Аляксей Зайцаў). Заваявала ўсіх сваім выступам маленькая беларуская зорачка Ксеня Сітнік, якая ў мінулым годзе паланіла гледачоў дзіцячага Еўрабачання. Сапраўды, і песня „дыска" ў яе выкананні, і вяснянка, дзе моцны голас маленькай Ксені пераліваўся глыбокімі старажытнымі галасамі беларускіх жанчын паказвае рэдкі талент. „Вялікі дзякуй! Віншую вас са святам!" — званіла са сцэны сваім моцным голасам дзяўчынка пад бурныя апладысменты тысяч рук. Ад сэрца са сятам павіншавала ўсіх, хто даклаўся да свят нашай душы і бабуля — Люба Гаўрылюк, „беластоцкі салавейка", чутны нават без мікрафонаў. Спявачка з Козлікаў спякла адмысловы торт з 150 грыбкамі, аздобіла кветкамі, і ганарыўся ён пасярод багатых пышных букетаў на сцэне ад улад Беларусі і іншых.

Міра Лукша

Пераможцы XIII Фестывалю Беларуская песня' 2006

Аўтэнтычны фальклор. Салісты: *1. Вера Нічыпарук (Маліннікі); 2. Валянціна Марціновіч (Краснае Сяло), Валянціна Клімовіч (Дабрывада), Ларыса Абрамовіч (Гарадок); 3. Вольга Ахрымюк (Чыжы), Кацярына Ціханюк (Збуч).* ***Дуэты, трыо, квартэты:*** *1. — , 2. дуэт Вера Лукошык, Ларыса Абрамовіч (Гарадок), 2. Квартэт з Дабрывады; 3. Квартэт з Чаромхі; квартэт „Збучанкі" (Збуч).* ***Вакальныя калектывы:*** *1. „НуБоШто" (Варшава), 2. „Арэшкі" (Арэшкава); 3. „Родына" (Дубяжын), „Крыўчанкі" (Крывец).*

Апрацаваны фальклор. Салісты: *1. Марыя Врублеўская (Гарадок); 2. Юры Карпюк (Ляўкова-Старое), Ніна Шыманская (Орля); 3. Анна Карэтка (Нараўка), Уладзімір Камарчук (Орля).* ***Дуэты, трыо, квартэты:*** *1. Трыо з Гайнаўскага белліцэя, Люба Гаўрылюк і Уладзімір Іванюк; 2. Маладзёжнае трыо з Беластока, дуэт Ірына Лапінская, Юры Карпюк (Ляўкова-Старое); Мужчынскі квартэт „Чыжавяне" (Чыжы), дуэт „Траяк" (Міхалова).* ***Вакальныя калектывы:*** *1. „Расспяваны Гарадок" (Гарадок); 2. „Рэчанька" (Козлікі), „Цаглінкі" (Ляўкова); 3. „Каліна" і „Калінка" (Залукі); вылучэнне: „Асенні ліст" (Гарадок).* ***Вакальна-інструментальныя калектывы:*** *1. „Прымакі" (Гарадок); 2. Жаночая група „Васілёчкаў" (Бельск-Падляшскі), „Клекацякі" (Боцькі), мужчынская група „Васілёчкаў"; 3. „Лучына" (Беласток); вылучэнне: „Кантрольны вобраз" (Нараўка).* ***Эстрадныя калектывы:*** *1. „Знічка" (Гайнаўка), „Дзявочыя ноткі" старэйшая група (Бельск-Падляшскі); 2. —; 3. „Бяседнікі" (Беласток).* ***Хоры:*** *1. „Загадка" (Супрасль) (узнагарода Радыё Беласток); 2. „Каласкі" (Беласток), „Васілёчкі" (Бельск-Падляшскі); 3. — ; вылучэнне: хор Гайнаўскага дома культуры.*

Сучасная песня. Салісты: *1. Крыстына Сульжыцкая (Варшава), Ала Каменская (Козлікі); 2. Амелія Горбач (Гайнаўскі белліцэй), Магдалена Чыквін (Гайнаўскі белліцэй); 3. Юліта Назарка (Гайнаўскі белліцэй), Мікалай Іванюк (Бельск-Падляшскі).* ***Дуэты, трыо, квартэты:*** *1. Маладзёжны квартэт (Беласток), сямейнае трыо Люба Гаўрылюк, Ала Каменская, Давід Дубэц; 2. дуэт Яўгенія Астапчук і Ніна Шыманская (Орля).* ***Вакальныя калектывы:*** *1. Жаночая група „Крыніцы" (Беласток), 2. Мужчынская група „Крыніцы", жаночая група „Чыжавян" (Чыжы).* ***Вакальна-інструментальныя калектывы:*** *1. „Маланка" (Бельск-Падляшскі), 2. „Чыжавяне" (Чыжы); „Арт Пронар" (Нарва).* ***Эстрадныя калектывы:*** *1. — ; 2. „Дзявочыя ноткі" малодшая група (Бельскі белліцэй), „Вэгас" (Грабаўка); 3. „Лайланд" (Беласток); вылучэнне: „Сакрэт" (Міхалова).* ***Хоры:*** *1. — ; 2. „Крыніца" (Беласток), „Куранты" (Бельск-Падляшскі).*

Міхась Хмялеўскі – сват на ўвесь свет

— Мой дэвіз — *Любіць людзей!*, — кажа Міхась Хмялеўскі — журналіст, аўтар кніжак „І так бывала" і „За годам год", дзеяч БГКТ, перакладчык, душа кампаніі, майстар па сватах (ажаніў 19 пар!).

„Ніва", як сам адзначае, адыграла асноўнае значэнне ў яго жыцці. Працаваў з 1956 па 1988 год, рэдагаваў старонку карэспандэнтаў і часта арганізаваў ім сходы, дзе быў цэлым закапёршчыкам, ладзіў таксама конкурс на найлепшага распаўсюджвальніка „Нівы". Рэдагаваў рубрыку „Настаўнікі роднай мовы", цыкл артыкулаў аб прадпрымальных і вынаходлівых — „Майстар на ўсе рукі", вёў хроніку БГКТ. Праславіўся як аўтар эратычных і крымінальных рэпартажаў з цыкла „І так бывае".

Найбольш любіў паездкі ў глыбінку, бо, як сам кажа, там натхняўся беларускай дабрынёй і гасціннасцю.

У сучаснай „Ніве" не бачыць нічога „на мінус", хоць, як адзначае, журналісты маюць лягчэй, бо няма ўжо над галавой партыйнага кантролю. **(гак)**

Стэфан Рыбі – паляк у „Ніве"

Мае 16 гадоў гадоў у „Ніве" як мастака былі адметнымі — бяспечнымі, спакойнымі, маладымі. Без стрэсаў. Не было ні прыкрых неспадзевак, ні нямілых уражанняў. Успамінаю іх з вялікім сантыментам. Перш за ўсё — цудоўныя людзі. Мы часам спрачаліся, але не было ніколі, каб былі мы адзін да аднаго варожа пастаўлены. Якраз наадварот. У той час я быў адзіным палякам у рэдакцыі. Я раней не ведаў беларусаў, аказалася, што яны — як усе, толькі больш сардэчныя, незайздросныя, без комплексаў. Галоўны дазваляў рабіць кожнаму па-свойму, але была дысцыпліна — я ведаў, што ў панядзелак мушу ўсе матэрыялы завезці ў друкарню. **(лук)**

Мікалай **Варанецкі**

Да юбілею „Нівы"

50 год „Ніве"!
50 год з „Нівай"
Беларусы ў Польшчы
Жывуць кожны тыдзень.

Прайшло паўстагоддзя
Калі выйшла „Ніва"
І па-беларуску
Нам загаварыла.

Ёсць у „Ніве" праўда,
Сатыра і гумар,
І палітыканства
Повен кожны нумар.

Чытач знойдзе ў „Ніве"
Сваю тэму, думку,
Свой горад і вёску —
Мілую старонку.

Аб буднях і святах
Расказвае „Ніва",
Аб долі гаротнай,
Аб долі шчаслівай.

А хто ёсць не скнара,
Не цалкам лянівы,
Той пойдзе на пошту
І падпішацца на „Ніву".

Каб „Ніва" жыла
Яшчэ доўга на свеце,
Каб роднае слова
Жыло на планеце!

Алесь Аркуш

Справа адзінаццаці

* * *

у невялічкім цягнічку
што шыбуе ў бок
першай польскай станцыі
кантрабандысты навучаюць мяне
як трымацца з польскімі
памежнікамі
пры гэтым неяк шматзначна
паглядаюць на мяне
як быццам даюць зразумець
ведаем што ты за гусь
але можаш на нас разьлічваць

* * *

над крыжамі
беластоцкага фарнага касьцёлу
завісла воблака
што ляцела з Полацку
на захад
усьлед за сонцам
усьлед усьлед
каб ніколі не засынаць
ляцець і ляцець
ляцець і ляцець
але так стаміў
воблака
шлях над Беларусяй
што яно
адолеўшы мяжу
вырашыла адпачыць
а лепшага месца для адпачынку
чымся нябесная затока
беластоцкага фарнага касьцёлу
сапраўды
цяжка і знайсьці

* * *

на беластоцкім кірмашы
на Антанюку
дзе прадаюць па нядзелях
розныя старыя рэчы
ад нямецкіх касак
да клямак ад вясковых хатаў
набыў жменю манэтаў
з выявамі польскіх каралёў
сьведкі падзеяў
здабыцьця волі
манэты ў сто і пяцьсот злотых —
як аповед
пра годнасьць
патрыятызм цяжкасьці
і трываньне

* * *

Fleetwood Mac
такім знаёмым голасам
зь беластоцкай FM-кі
запрашае да гарбаты
кіпень сапраўды ўжо гатовы
і лусьцікі накроены
дваццаць восемь гадоў таму
пад Fleetwood Mac
пры выключаным сьвятле
мы танчылі
на маіх провадах у войска
і цалаваліся
і марылі
і абяцалі
мары ня спраўдзіліся
абяцаньні даўно парушаны
засталіся толькі ўспаміны
пра дотыкі дзявочых вуснаў

* * *

я хацеў напісаць верш
ды толькі дождж мне перашкодзіў
ён размыў сьцяжыны
і зьнішчыў твае сьляды
цяпер я блукаю
паміж нашымі
першай і апошняй
сустрэчамі
між якімі ўзышла
вясёлка

Агульная справа адзінаццаці

адзінаццаць чалавек
сядзяць на падсуднай лаве
у Беластоцкім раённым судзе
Алега Латышонка
як сьведку па справе
выдаляюць з судовай залі
не бяда —
двухмэтровы Алег бачыць
здалёку
Лена Глагоўская выкладчыцкім
позіркам
узіраецца ў мяне —
спрабуе пазнаць
мы ня бачыліся бадай
гадоў десяць
разам зь Мірай Лукшай
яны сядзяць
паміж двума Яўгенамі —
Мірановічам і Вапай
можна загадваць жаданьне
ня важна
што прачытае пракурор
у абвінаваўчай прамове
ня важна
якія пытаньні задасьць судзьдзя
адзінаццаці падсудным
важнасьць не вызначаецца
ў судзе
у адзінаццаці абвінавачаных
ёсьць агульная справа
па якой
свой суворы прысуд
вынясе сама гісторыя

Мікалай Панфілюк

„Ніва” падымайся

„Ніва” калыхайся,
Вышэй падымайся,
Дай вялікі плён,
Шлю табе паклон
Ад душы і сэрца.
Чытачы, паверце:
„Ніва” — хлеб духоўны,
Корміць нас па-роўнаму.
Будзем яе трымацца,
Праўдай займацца.
Каб нас не тапталі,
А ў свеце праслаўлялі,
Што маем паэтаў,
Якіх важнай мэтай:
Праслаўляць народ,
Беларускі род.
Праслаўляць прыроду
І даваць свабоду,
Ісці з Пагоняй мужна
І трымацца дружна —
Як адна сям'я
Дачакацца дня
Калі нас пабачаць
І прызнаць наважаць.
Маем і пісьменнікаў,
Сонечных пляменнікаў,
Ночку азараюць,
Усіх нас праслаўляюць.
Маем і вучоных
Знатных, не адмоўных —
Свет пра іх ужо знае,
Паважае, дбае.
Селянін не спіць,
Думае як жыць,
Працу вельмі любіць,
Шчыра прыгалубіць.
Мірны мы народ,
Беларускі род:
Нам вайна чужая,
Заўсёды ліхая.
„Ніва”, наша матка,
Сімвалам парадкаў.
Праз яе праходзім
І шчасце знаходзім.
Хай яна свяціцца,
А нам усім маліцца,
Што маем газету родную,
Цікавую, свабодную.

Уладзімір Сасна

З Пашкоўшчыны

Хто ж не знае „Нівы”
Родам з Беластока:
Усё з чорнымі валасамі
Дый і чарнавокай!

Валос не фарбавала,
І не „падкрашала”,
У добрым здароўі
Пяцьдзесят дачакала.
Вельмі не ўбіралась,
Па летку хадзіла,
А што было трэба,
Усё яна рабіла.

У добрым здароўі
Да ста год трымайся!
Што ты беларуска —
Такой заставайся!

Цябе не забуду,
Ста гадоў жадаю,
Як стрываеш сотню,
Дык другую маю.

Я чалавек ад плуга,
Такога сабе ўзросту,
Пішу пару словаў
Так сабе па-просту.

Я ад цябе старэйшы,
Дзедкам можаш зваці.
Пакуль жыці буду,
Не кіну чытаці!

Мікалай Лук'янюк

Залаты юбілей

З нагоды юбілею
Шчасця я ўсім жадаю,
Тым, што „Ніву” ўтваралі,
Каб добрае здароўе мелі.
А цяперашнім рэдактарам „Нівы”,
Каб усе жылі шчасліва
Моцнае здароўе мелі
І ніколі не хварэлі.
А за тых, што адышлі
У вечную дарогу,
Трэба памаліцца
Ды прасіць у Бога,
Каб у зямельцы-маці
Было ім лёгка
Як у пуху ляжаці.
А дзеткам, што пішуць
У родную „Зорку”
Каб у школе вы мелі
Не адну шасцёрку.
Лідэрам беларускім,
Каб паядналіся,
Ды адзін з другім
Ніколі не спрачаліся.
Запрашаю я вас
У нейтральную хату,
Каб жылі шчасліва
Вы ўсе дый багата.
Вось за гэта братцы
Вас буду выхваляць
Цябе, Яўген Чыквін,
Прашу ўсіх паяднаць.
Я буду маліцца
Магутнаму Богу,
Каб навёў усіх нас
На добрую дарогу.